Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2023 годзе

## Аналітычны агляд

spring96.org

## Высновы

- катастрафічнае становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі адзначана аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі;
- Праваабарончаму цэнтру "Вясна" на канец 2023 года вядома пра 4 248 асуджаных да розных відаў пакарання паводле палітычна матываваных абвінавачванняў, 910 з гэтай колькасці — жанчыны. У мінулым годзе асуджаны 1 603 чалавекі з іх;
- вынікам крымінальнага пераследу стала наяўнасць у Беларусі на 1 студзеня 2024 года 1 452 палітзняволеных, прызнаных такімі праваабарончай супольнасцю; з іх 168 — жанчыны; 535 палітвязняў — маладзёны. Яшчэ 1 413 чалавек, з іх 339 жанчын, пасля пазбаўлення волі паводле палітычных матываў вызвалены ў сувязі з адбыццём пакарання, зменай меры стрымання, прызначэннем пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі, пасля знаходжання пад вартай, вызваленнем у парадку памілавання;
- судамі вынесена не менш за 4 466 адміністрацыйных пастаноў, з іх у 1 822 выпадках накладзены штраф і ў 2 005 выпадках ужыты адміністрацыйны арышт, 38 спраў спынена, вынікі разгляду астатніх спраў невядомыя;
- пры захаванні высокага узроўню крымінальных рэпрэсій стала значна больш крымінальных спраў паводле абвінавачвання ў стварэнні, кіраўніцтве і ўдзеле ў экстрэмісцкіх фармаваннях, садзейнічанні і фінансаванні экстрэмісцкай дзейнасці; захавалася вялікая колькасць крымінальных спраў за ўдзел у вулічных пратэстах і выказванні ў сетцы Інтэрнэт;
- палітычных зняволеных утрымоўваюць у асабліва жорсткіх умовах, пад надзвычай строгім кантролем, на іх накладаюцца не прадугледжаныя законам абмежаванні; у выніку шматлікія палітвязні ў дысцыплінарным парадку пазбаўленыя вызначаных згодна з законам пасылак, перадач, у тым ліку лекавых, спатканняў з роднымі, жонкамі і мужамі, адвакатамі; ліставанне палітвязняў адвольна абмежаванае;
- палітзняволеных накіроўваюць на прымусовую малааплатную працу;
- асаблівасцю 2023 года стала змяшчэнне некаторых палітвязняў у поўную ізаляцыю — у становішча інкамунікада;
- не менш як 29 палітвязням, шасцярым (у тым ліку дзвюм жанчынам) з іх двойчы, працягвалі тэрміны пазбаўлення волі;
- асабліва цяжка пераносяць пазбаўленне волі людзі з інваліднасцю, хранічнымі захворваннямі, пажылыя людзі; часцяком ім ствараюць невыносныя ўмовы без уліку іх уразлівага становішча;
- пасля выхаду на волю па адбыцці пакарання палітзняволеныя трапляюць пад надзвычай строгі кантроль, які выходзіць за межы звычайнага нагляду за вызваленымі асуджанымі; правы асуджаных дадаткова абмяжоўваюцца наступствамі ўключэння ў пералік асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці;
- суды працягваюць функцыянаваць у якасці інструмента рэпрэсій у дачыненні да фігурантаў палітычна матываваных адміністрацыйных, крымінальных і грамадзянскіх спраў;
- грамадска-палітычны сектар скарачаецца ў выніку ліквідацыі ці прымусу да самаліквідацыі, а таксама іншых рэпрэсіўных мер;
- працягваецца пераслед за мірнае выказванне меркаванняў, пераслед пад выглядам барацьбы з тэрарызмам і экстрэмізмам;

- пераследуюцца журналісты, супрацоўнікі СМІ і блогеры;
- працягваецца пераслед за антываенную пазіцыю;
- катаванні і забароненае абыходжанне застаюцца для карных органаў інструментам ціску і запалохвання; няма выпадкаў расследавання і прыцягнення да адказнасці асобаў, вінаватых у шырокамаштабных катаваннях і іншых вельмі грубых парушэннях правоў чалавека ў жніўні 2020 года і ў наступных гадах, на нацыянальным узроўні;
- улады парушаюць права на жыццё: палітзняволеныя Алесь Пушкін і Мікалай Клімовіч памёрлі ў няволі ў выніку неаказання медыцынскай дапамогі;
- пашыраецца сфера ўжывання смяротнага пакарання; вынесены новы смяротны прысуд.

## Уводзіны

Становішча з правамі чалавека ў Беларусі працягвае заставацца крытычна цяжкім. Таталітарны рэжым паслядоўна замацоўвае створаныя пры дапамозе жорсткіх рэпрэсій перашкоды для рэалізацыі правоў і асноўных свабод, а таксама функцыянавання арганізацый грамадзянскай супольнасці; нагнятае атмасферу страху і безабароннасці перад карнымі органамі ўлады.

Ніякія спробы імітаваць мір і згоду ва ўзаемаадносінах паміж дыктатурай і народам не могуць схаваць бясспрэчны факт таго, што асновай існавання цяперашняй улады з'яўляюцца не дэмакратычныя працэсы, а грубая сіла, а таксама страх і бездапаможнасць, якія існуюць пры палітычнай і эканамічнай падтрымцы Расійскай Федэрацыі.

У адказ рэжым падтрымлівае агрэсію РФ у дачыненні да Украіны, жорстка душыць антываенны пратэст і ўкараняе антыўкраінскі і антыдэмакратычны наратыў з дапамогай рэсурсаў прапаганды.

Адмовіўшыся ад бяз'ядзернага статусу, улады садзейнічалі размяшчэнню ў Беларусі ядзернай зброі, прыпынілі дзеянні Дамовы аб звычайных узброеных сілах у Еўропе ў дачыненні да Рэспублікі Польшча і Чэшскай Рэспублікі, забяспечылі магчымасці для размяшчэння на тэрыторыі дзяржавы расійскіх наймітаў з "групы Вагнера". Гэтыя дзеянні павялічваюць пагрозы міру і міжнароднай стабільнасці.

Катастрафічнае становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі адзначана шматлікімі аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі:

Дакладчык АБСЕ ў межах Маскоўскага механізму прафесар **Эрве Асэнсіа** 11 траўня 2023 года прадставіў Пастаяннаму савету АБСЕ свае высновы, сабраныя ў "Дакладзе аб сур'ёзнай пагрозе чалавечаму вымярэнню АБСЕ ў Беларусі з 5 лістапада 2020 года", ключавой ідэяй якога стала заява пра тое, што за апошнія два гады *"была ажыццёўлена вялікая колькасць дзеянняў, што ўяўляюць сур'ёзную пагрозу чалавечаму вымярэнню АБСЕ. Яны парушаюць палітычныя правы і дэмакратычны працэс, свабоду сходаў і аб'яднанняў, свабоду выказвання меркаванняў і права на доступ да інфармацыі, права на свабоду і асабістую недатыкальнасць, права не зведваць катаванні і іншыя жорсткія, бесчалавечныя ці зневажальныя годнасць віды абыходжання і пакаранні, права на справядлівы судовы разгляд і права на эфектыўныя сродкі прававой абароны".*

**Анаіс Марэн**, Спецыяльная дакладчыца ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, у сваім дакладзе адзначыла мэтанакіраваную палітыку дзяржавы па зачыстцы грамадзянскай прасторы ад яе апошніх іншадумных элементаў: *"Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі няўхільна пагаршаецца, бо ў 2020 годзе рэпрэсіі дасягнулі беспрэцэдэнтнага ўзроўню"*. На 53-й сесіі Савета па правах чалавека 13 ліпеня адбыўся разгляд і галасаванне па рэзалюцыі па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Рэзалюцыяй працягнуты на год мандат Спецдакладчыка.

Даклад УВКПЧ ААН быў апублікаваны 17 сакавіка 2023 года. У ім змяшчаюцца высновы УВКПЧ па выніках разгляду сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі за перыяд з 1 траўня 2020 па 31 снежня 2022 года, праведзенага ў адпаведнасці з даручэннем Савета ААН па правах чалавека: *"парушэнні, як уяўляецца, здзяйсняліся у межах кампаніі гвалту і рэпрэсій, свядома накіраванай супраць тых, хто знаходзіўся ў апазіцыі да ўлады ці выказваў крытычнае меркаванне, або падазраваўся ў гэтым. Аўтары дакладу мяркуюць, што некаторыя з гэтых парушэнняў могуць быць прыраўнаваныя да злачынстваў супраць чалавечнасці"*.

На 52-й сесіі ААН была прынятая рэзалюцыя Савета па правах чалавека аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. Мандат місіі УВКПЧ ААН па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі рэзалюцыяй падоўжаны на год.

У Рэзалюцыі Еўрапарламента ад 14 снежня 2023 г. прагучаў заклік да дзяржаў-сябраў забяспечыць пастаяннае дакументаванне міжнародных злачынстваў рэжыму і патрабаваць адказнасці на ўзроўні ААН, з дапамогай місіі УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і пры захаванні мандата Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

Улады Беларусі адмаўляюцца прызнаваць парушэнні і супрацоўнічаць з міжнароднымі арганізацыямі ў гэтым кірунку.

Адначасова ўлады працягваюць атакі на праваабаронцаў і праваабарончыя арганізацыі. Праваабаронцы "Вясны": старшыня арганізацыі і лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру **Алесь Бяляцкі**, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDH) **Валянцін Стэфановіч**, юрыст і каардынатар кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" **Уладзімір Лабковіч**, каардынатарка Валанцёрскай службы "Вясны" **Марфа Рабкова**, валанцёр **Андрэй Чапюк** — асуджаныя да пазбаўлення волі і адбываюць пакаранне ў папраўчых калоніях. Сябра "Вясны" **Леанід Судаленка** быў вызвалены з калоніі пасля адбыцця ўсяго тэрміна пакарання і неўзабаве зазнаў новы адвольны крымінальны пераслед. Праваабаронца **Наста Лойка** асуджаная да сямі гадоў пазбаўлення волі згодна з адвольным палітычна матываваным абвінавачваннем і ўтрымоўваецца ў калоніі.

Неаднаразова зведвалі затрыманні рэгіянальныя праваабаронцы і журналісты.

На фоне рэпрэсій, адмовы ад абавязальніцтваў у галіне правоў чалавека і разбурэння суб'ектаў грамадзянскай супольнасці ўлады распачалі фармаванне новага складу заканадаўчага органа і мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Кампанія "Праваабаронцы за свабодныя выбары" абвесціла аб пачатку працы экспертнай місіі па назіранні за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання і мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання, якія пройдуць у Беларусі 25 лютага 2024 года.

## Адміністрацыйны і крымінальны пераслед паводле палітычных матываў. Палітычныя зняволеныя

Пасля пачатку выбарчай кампаніі 2020 года беларусы сутыкнуліся з небывалым да таго маштабам крымінальнага пераследу пратэстоўцаў, іншадумцаў і палітычных апанентаў улады. Распаўсюджанымі формамі рэпрэсій апанентаў рэжыму вось ужо чацвёрты год застаецца іх крымінальны і адміністрацыйны пераслед. Праваабарончы цэнтр "Вясна" вядзе маніторынг гэтага працэсу і збірае звесткі пра палітычна матываваны крымінальны і адміністрацыйны пераслед.

У мінулым 2023 годзе праваабаронцы зафіксавалі не менш за 6 386 фактаў рэпрэсій крымінальнага і адміністрацыйнага характару, з іх 1 776 — у адносінах да жанчын і 4 566 — у адносінах да мужчын (у рэшце выпадкаў пол невядомы. З іх: у Мінску і Мінскай вобласці — 1 535, у Віцебску і Віцебскай вобласці — 971, у Магілёве і Магілёўскай вобласці — 436, у Брэсце і Брэсцкай вобласці — 943, у Гомелі і Гомельскай вобласці — 1 345, у Гродне і Гродзенскай вобласці — 1 023 факты.

Судамі вынесена не менш за 4 466 адміністрацыйных пастаноў, з іх у 1 822 выпадках накладзены штраф і ў 2 005 выпадках ужыты адміністрацыйны арышт, 38 спраў спынена, вынікі разгляду астатніх спраў невядомыя.

За 2023 год "Вясне" вядома пра асуджэнне ў крымінальным парадку 1 603 чалавек, з іх 27% — жанчыны. Не менш як 463 чалавекі асуджаныя да пазбаўлення волі (у тым ліку адзін з адтэрміноўкай выканання пакарання), не менш як 51 — да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, не менш як 389 — без накіравання.

Вынікам крымінальнага пераследу стала наяўнасць у Беларусі на 1 студзеня 2024 года 1 452 палітзняволеных, прызнаных такімі праваабарончай супольнасцю; з іх 168 — жанчыны. Яшчэ 1 413 чалавек, з іх 339 жанчын, пасля пазбаўлення волі паводле палітычных матываў вызвалены ў сувязі з адбыццём пакарання, зменай меры стрымання, вызваленнем у парадку памілавання.

На 1 студзеня 2024 года са 168 палітзняволеных жанчын 123 утрымоўваюцца ў Папраўчай калоніі № 4, не менш за тры — у папраўчай калоніі № 24. У ёй знаходзяцца тыя, хто раней адбываў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі: туды накіроўваюцца палітзняволеныя жанчыны, якім тэрмін пазбаўлення волі працягнуты дадатковым адвольным асуджэннем паводле арт. 411 КК. **Таццяна Канеўская** знаходзіцца ў турме — гэта найбольш строгі рэжым утрымання асуджаных. Не менш за 21 палітзняволеную ўтрымоўвалася ў СІЗА да суда ці да моманту, калі прысуд набыў законную моц. Месцазнаходжанне пяці палітзняволеных жанчын невядомае.

У калоніях для ўпершыню асуджаных да пазбаўлення волі ўтрымоўваюцца не менш за 590 палітвязняў-мужчын з 1 255; не менш за 39 — у калоніях для тых, хто раней адбываў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі; не менш за 10 — у ПК № 8 для ўтрымання і лячэння асуджаных, хворых на актыўную форму сухотаў; 71 — у следчых ізалятарах; 114 — у турмах (у тым ліку не менш як 54 асуджаныя да пазбаўлення волі ў турме ці пераведзеныя ў турму для адбывання пакарання); 7 — у выхаваўчай калоніі; не менш за 110 — у папраўчых установах адкрытага тыпу. Месцазнаходжанне астатніх палітвязняў невядомае.

Палітзняволеным, якія ўтрымоўваюцца ў цяперашні момант у месцах пазбаўлення волі, былі выстаўленыя наступныя абвінавачванні (шмат каму паводле некалькіх артыкулаў): самая вялікая колькасць — 382 чалавекі — прыцягнуты да адказнасці паводле ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса згодна з абвінавачваннем у арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўным удзеле ў іх. Таксама больш за 180 палітыкаў, актывістаў, блогераў і ўдзельнікаў вулічных пратэстаў асуджаны паводле арт. 293 КК згодна з абвінавачваннем у арганізацыі і ўдзеле ў масавых беспарадках. Паводле арт. 130 КК, які прадугледжвае адказнасць за распальванне "іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы", выставілі абвінавачванні 308 палітзняволеным. Паводле дыфамацыйных складаў злачынстваў абвінавачванні ў абразе прадстаўнікоў улады, Лукашэнкі, суддзяў, паклёпе на Лукашэнку ў адпаведнасці з артыкуламі 369, 368, 391, 367 КК выставілі адпаведна 286, 365, 40 і 106 разоў. У знявазе дзяржаўных сімвалаў паводле арт. 370 КК былі абвінавачаныя 50 чалавек. Абвінавачванні ў закліках да мер абмежавальнага характару (санкцый) згодна з арт. 361 КК выставілі 81 палітвязню. Абвінавачванні ў стварэнні экстрэмісцкага фармавання або ўдзеле ў ім, фінансаванні і садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці паводле арт. 361-1, 361-2, 361-4 КК выставілі адпаведна 113, 49 і 94 палітзняволеным; ва ўдзеле на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фармаванні ці ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, вербаванні або падрыхтоўцы асобаў да такога ўдзелу — 19. Абвінавачванне ў розных формах тэрарызму паводле арт. 359 і 289 КК выстаўлена 64 палітвязням.

Вялікая частка былых палітзняволеных абвінавачвалася паводле арт. 342 КК (больш за 750), дыфамацыйных складаў злачынстваў (384 абвінавачванні), каля 100 чалавек абвінавачвалася ў супраціве супрацоўнікам органаў унутраных спраў, гвалце ці пагрозах гвалту ў дачыненні да іх, 95 — у распальванні "іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы".

Аснову для пераследу складаюць тысячы крымінальных спраў, якія ўлады распачалі ў сувязі з падзеямі апошніх гадоў. Няўхільны рост колькасці гэтых спраў аспрэчвае тэзы аб скарачэнні ўзроўню рэпрэсій, спыненні палітычнай і грамадскай актыўнасці ў Беларусі. Таксама гэта дае ўяўленне аб патэнцыяле палітычна матываванага крымінальнага пераследу.



У табліцы адзначана заяўленая прадстаўнікамі ўладаў колькасць распачатых крымінальных спраў на адпаведны месяц. Апошнія звесткі наконт колькасці распачатых крымінальных спраў паведаміў генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Андрэй Швед, выступаючы ў лістападзе 2023 года на форуме генеральных пракурораў краін ШАС. Да гэтага ён жа заяўляў пра 6 000 крымінальных спраў, распачатых за 2022 год.

Шырока практыкуючы пагрозы ў адрас нязгодных, распаўсюджваючы на прапагандысцкіх інфармацыйных рэсурсах жахлівыя сцэны гвалту ў дачыненні да іх, улады адначасова хаваюць дэзагрэгаваныя звесткі пра крымінальны пераслед паводле палітычных матываў: агульная колькасць асуджаных называецца зрэдку, а статыстыка па асобных складах абвінавачванняў наогул не публікуецца. Апошні раз звесткі пра асуджаных (у рыторыцы чыноўнікаў пракуратуры і суда — за здзяйсненне экстрэмісцкіх злачынстваў) былі агучаны генеральным пракурорам напрыканцы лютага 2023 года: было асуджана 3 645 чалавек паводле амаль 3 000 крымінальных спраў.

Такім чынам, афіцыйных звестак пра тое, колькі чалавек на канец 2023 года асуджана паводле палітычных матываў, няма. Тым часам, захаванне дынамікі рэпрэсій дае падставы меркаваць, што гэтая колькасць магла дасягнуць ці перавысіць 5 000 чалавек.




Доля пакаранняў у выглядзе пазбаўлення волі згодна з прысудамі ў дачыненні да асуджаных паводле палітычных матываў да лютага 2022 складала 36,2%, да лютага 2023 года практыка зрабілася істотна больш жорсткай — 42% пакаранняў у выглядзе пазбаўлення волі. Таксама да лютага 2023 года 20% асуджаных паводле палітычных матываў прызначылі абмежаванне волі з накіраваннем ва ўстановы адкрытага тыпу. Такім чынам, у адпаведнасці з крытэрамі праваабаронцаў, якія расцэньваюць абмежаванне волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу як форму пазбаўлення волі, каля 62% асуджаных паводле палітычных матываў былі пазбаўлены волі згодна з прысудам суда; таксама штодзённай практыкай з'яўляецца ўтрыманне абвінавачаных паводле палітычна матываваных спраў пад вартай без уліку цяжкасці абвінавачванняў, асобы абвінавачаных, і што галоўнае — пры адсутнасці даказанай небяспекі таго, што абвінавачаны ўцячэ ці будзе перашкаджаць расследаванню. Гэта значна больш

жорсткая, чым звычайна, практыка ўжывання мер стрымання і прызначэння крымінальных пакаранняў: згодна са статыстыкай за 2022 год, судамі Беларусі прызначана пазбаўленне волі і абмежаванне волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу адпаведна 21,1% і 5,3% асуджаных. Таксама некалькі дзясяткаў чалавек (не менш за 70) асуджаны да арышту — пазбаўлення волі ў турэмных умовах тэрмінам да трох месяцаў.

Сярод вядомых ПЦ "Вясна" на канец 2023 года 4 248 асуджаных паводле палітычна матываваных абвінавачванняў — 910 жанчын.

Вялікая частка асуджаных — 43,8% — асуджаныя да пазбаўлення волі; 15,1% — да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, 26,7% — без накіравання; 1,7% — да арышту, 1% — да штрафу. Іншыя меры крымінальнай адказнасці ўжываліся вельмі рэдка, што нехарактэрна для судовай практыкі прызначэння пакаранняў за злачынствы без палітычнага матыву.




У Пераліку асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, куды ўключаюць асуджаных паводле "экстрэмісцкіх" складаў злачынстваў, на канец 2023 года налічваецца 3 654 чалавекі. Варта адзначыць, што ў гэты спіс унеслі не ўсіх асуджаных паводле палітычных матываў, і яго папаўненне гэтага адбываецца бессістэмна: напрыклад, асуджаных да пазбаўлення волі праваабаронцаў "Вясны", чый прысуд набыў моц напрыканцы красавіка 2023 года, унеслі ў пералік у снежні. На люты 2023 года, калі колькасць асуджаных за здзяйсненне "экстрэмісцкіх злачынстваў", паводле прызнання генпракурора, было больш за 3 600 чалавек, у Пералік было ўключана каля 2 500 чалавек.

Сабраныя "Вясной" звесткі пра палітычна матываванае асуджэнне хоць і не з'яўляюцца поўнымі (адсутнічае інфармацыя пра прыблізна 20% выпадкаў, хутчэй за ўсё, пераважна не звязаных з пазбаўленнем волі), даюць аб'ектыўнае ўяўленне пра выстаўленыя абвінавачванні. Варта

ўлічваць, што аднаму асуджанаму магло быць выстаўлена некалькі абвінавачванняў. Структура крымінальнага пераследу, згодна са звесткамі "Вясны", галоўным чынам адпавядае структуры крымінальнага пераследу ў адпаведнасці са звесткамі Пераліку асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці.




У 2023 годзе захаваўся высокі ўзровень крымінальных рэпрэсій, але структура абвінавачванняў часткова змянілася, што можна прасачыць па звестках ПЦ "Вясна" і Пераліку асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці: стала заўважна больш крымінальных спраў паводле абвінавачвання ў стварэнні, кіраўніцтве і ўдзеле ў экстрэмісцкіх фармаваннях, садзейнічанні і фінансаванні экстрэмісцкай дзейнасці. Пры гэтым захаваўся высокі ўзровень асуджэнняў за ўдзел у вулічных пратэстах згодна з ч. 1 арт. 342 КК, за выказванне ў сетцы Інтэрнэт паводле арт. 130 КК — за распальванне "іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы", абразу Лукашэнкі і паклёп на яго. Зменшылася колькасць выпадкаў асуджэння за іншыя дыфамацыйныя злачынствы.

## Становішча палітзняволеных

Палітычных зняволеных утрымоўваюць ва ўстановах Дэпартамента выканання пакаранняў МУС разам з іншымі асуджанымі за здзяйсненне злачынстваў. Там для іх ствараюцца асабліва жорсткія ўмовы адбывання пакарання, надзвычай строгі кантроль за выкананнем патрабаванняў рэжыму, накладаюцца не прадугледжаныя законам абмежаванні. У выніку шмат якія палітвязні ў дысцыплінарным парадку пазбаўлены вызначаных у адпаведнасці з законам пасылак, перадач, у тым ліку лекавых, спатканняў з роднымі, мужамі і жонкамі, адвакатамі. Ліставанне палітзняволеных адвольна абмежаванае ў найлепшым выпадку колам блізкіх сваякоў, мужоў і жонак, а ў некаторых выпадках перыядычна спыняецца. Варта адзначыць, што нават без дадатковага ціску сітуацыя ў месцах пазбаўлення волі такая, што ўтрыманне там можа прыраўноўвацца да жорсткага, зневажальнага, бесчалавечнага абыходжання. Палітвязняў накіроўваюць на прымусовую малааплатную працу.

Асаблівасцю 2023 года стала змяшчэнне некаторых палітзняволеных у суцэльную ізаляцыю, якая ўключае ў сябе поўную адсутнасць інфармацыі ад іх і пра іх. **Марыю Калеснікаву** (з 15 лютага), **Мікалая Статкевіча** (з 10 лютага), **Сяргея Ціханоўскага** (з 9 сакавіка), **Ігара Лосіка** (з 20 лютага), **Віктара Бабарыку** і некаторых іншых палітвязняў працягла — на працягу некалькіх месяцаў — утрымоўваюць інкамунікада.

У калоніях і турмах ужываюцца розныя спосабы прычынення палітвязням асаблівых пакутаў — ад збівання асобамі, якія дзейнічаюць у афіцыйнай якасці, як гэта адбылося з Віктарам Бабарыкам, збіванні іншымі зняволенымі, якія дзейнічаюць згодна з ўказаннем і з ведама ўладаў, пра што заяўляла **Паліна Шарэнда-Панасюк**, — да дзеянняў адміністрацыі, якія захоўваюць бачнасць законнасці: змяшчэння зняволеных за нязначныя ці выдуманыя правіны ў штрафны ізалятар, памяшканне камернага тыпу, адзіночную камеру, у турму. У штрафных ізалятарах зняволеныя ўтрымоўваюцца ў максімальна неспрыяльных умовах, без пасцельных прыналежнасцяў і цёплага адзення, у некамфортнай тэмпературы, без сувязі з навакольным светам, без магчымасці заняць сябе, без кантакту з іншымі асобамі, часта некалькі максімальных тэрмінаў (10 сутак) запар.

У ПКТ Папраўчай калоніі № 9 утрымоўваецца лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру **Алесь Бяляцкі**.

Асабліва цынічнай з'яўляецца практыка адвольнага працягнення тэрміну пазбаўлення волі пад выглядам пакарання за злоснае непадпарадкаванне адміністрацыі папраўчай установы згодна з арт. 411 КК. У адпаведнасці з, магчыма, няпоўнымі звесткамі "Вясны", паводле стану на канец 2023 года згодна з арт. 411 КК асуджана 29 палітвязняў, шасцёра (у тым ліку дзве жанчыны) з іх двойчы: **Іван Вярбіцкі**, **Вікторыя Кульша**, **Андрэй Навіцкі**, **Уладзімір Цыгановіч**, **Паліна Шарэнда-Панасюк**, **Вячаслаў Маляйчук**. Кожнае асуджэнне можа дадаць да тэрміну пакарання ад некалькіх месяцаў да двух гадоў пазбаўлення волі ў залежнасці ад цяжкасці першапачатковага абвінавачвання і спосабу складання пакаранняў.

Да прыкладу, Паліна Шарэнда-Панасюк мусіла выйсці на волю 6 жніўня 2023 года, цалкам адбыўшы свой двухгадовы тэрмін зняволення. У выніку двух асуджэнняў паводле арт. 411 КК тэрмін яе пакарання працягнуты да кастрычніка 2024 года — больш як на год.

У адпаведнасці са звесткамі праваабаронцаў, па стане на 30 снежня 2023 года прынамсі 66 палітвязняў перавялі на турэмны рэжым і супраць яшчэ 32 распачалі новыя крымінальныя справы паводле арт. 411 КК.

Да палітзняволеных не ўжываюць ніякіх формаў скарачэння ці замены пакарання за добрыя паводзіны і амністый.

Асабліва цяжка пераносяць пазбаўленне волі людзі з інваліднасцю, хранічнымі захворваннямі, пажылыя людзі. Часцяком ім [ствараюць](#) невыносныя ўмовы без уліку іх уразлівага становішча. Такіх людзей сярод палітвязняў не менш за 90.

Асобнай праблемай з'яўляецца прымусовае псіхіятрычнае лячэнне людзей, якія маюць псіхічныя разлады і ўчынілі дзеянні, што маюць прыкметы злачынстваў з катэгорыі экстрэмісцкіх. Змяшчэнне іх на стацыянарнае прымусовае лячэнне мае ўсе прыкметы адвольнага пазбаўлення волі, бо, як правіла, "злачынствам" робяцца іх выказванні.

Пасля адбывання пакарання і выхаду на волю палітвязні [падпадаюць](#) пад надзвычай строгі кантроль з боку тэрытарыяльных органаў унутраных спраў, які выходзіць за межы звычайнага нагляду за вызваленымі асуджанымі. Ёсць выпадкі паўторнага крымінальнага праследу вызваленых палітвязняў. У дачыненні да асуджаных да абмежавання волі паводле палітычных матываў часта фіксуецца прадузятае стаўленне тэрытарыяльных органаў унутраных спраў, што стварае аснову для адвольнага накладання дысцыплінарных спагнанняў, вынікам якіх, у сваю чаргу, робіцца замена асуджаным віду пакарання на пазбаўленне волі. Праз гэта шматлікія вызваленыя палітзняволеныя і асуджаныя да абмежавання волі вымушаныя ўцякаць за межы Беларусі, ратуючыся ад адвольнага пазбаўлення волі.

## Парушэнне права на справядлівы судовы разгляд

Суды, з'яўляючыся залежнымі ад выканаўчай улады і прэзідэнцкай вертыкалі, працягваюць функцыянаваць у якасці інструменту рэпрэсій у дачыненні да фігурантаў палітычна матываваных адміністрацыйных, крымінальных і грамадзянскіх спраў.

Крымінальныя рэпрэсіі ажыццяўлялі больш як 400 з 1 200 суддзяў судоў рознага ўзроўню — ад раённых да Вярхоўнага. Максімальную вядомую колькасць людзей паводле палітычных матываў з 2020 года асудзілі: Вікторыя Шабуня — 79; Юльяна Шчэрба — 74; Дзмітрый Карсюк — 70; Яўген Брэган — 56; Максім Трусевіч — 54; Вольга Емяльянчанка — 50; Вера Філонік — 45; Анастасія Ачалава — 44; Анжэла Касцюкевіч — 43; Сяргей Хрыпач, Сяргей Кацэр, Іна Сівец — па 39; Міхаіл Макарэвіч, Сяргей Шаціла — па 36; Таццяна Пірожнікава, Алена Жуковіч, Жанна Хвайніцкая — па 35; Аляксандр Семянчук — 34; Таццяна Шоцік — 33; Андрэй Млечка, Іна Клышпач, Аляксандр Воўк — па 31; Кацярына Мурашка — 30; Алена Бушава, Яўген Ярафееў — па 29; Юлія Крэпская, Лідзія Целіца — па 28; Святлана Бандарэнка, Алена Капцэвіч, Марына Фёдарава, Юлія Шчоткіна — па 27; Наталля Дзядкова, Мікалай Кміта, Дзмітрый Астапенка — па 25.

Найбольш жорсткія прысуды (звыш 20 гадоў пазбаўлення волі) вынеслі Максім Філатаў, Уладзімір Арэшка, Сяргей Хрыпач, Анатоль Сотнікаў, Ігар Шведаў, Вячаслаў Тулейка, Сяргей Епіхаў.

Праслед праваабаронцаў, і асобна тых, хто прысутнічае на судовых пасяджэннях па палітычна матываваных справах, робіць небяспечным наведванне судовых разглядаў і ажыццяўленне грамадскага маніторынгу працы судоў.

Разгляд судамі адміністрацыйных спраў працягваў ажыццяўляцца фактычна непублічна. У раскладзе судовых пасяджэнняў на партале "Электронная вытворчасць", а нярэдка — і ў памяшканні судоў, інфармацыя пра час і месца разгляду справы адсутнічала. Працягвалася практыка правядзення судовых пасяджэнняў праз дыстанцыйныя сродкі сувязі, без дастаўлення затрыманых у суд.

Разгляд судамі палітычна матываваных крымінальных спраў у шматлікіх выпадках праходзіў у закрытым судовым пасяджэнні без належнага абгрунтавання такой неабходнасці. Такая практыка датычыцца як рэзанансных спраў (напрыклад, судовыя разгляды ў дачыненні да рэдакцыі TUT.BY, дзеяча культуры **Паўла Белавуса** и музыкаў TOR BAND), гэтак і не (напрыклад, судовы разгляд у дачыненні да **Антона Хадкевіча** і шматлікіх іншых). Акрамя таго, судовыя пасяджэнні па пераглядзе рашэнняў аб затрыманні і змяшчэнні пад варту да суда, згодна з указаннем закона (ч. 2 арт. 144 КПК), аўтаматычна праводзяцца ў закрытым судовым пасяджэнні.

Парушаецца права быць асуджаным у сваёй прысутнасці: затрыманыя па крымінальных справах не дастаўляюцца ў судовыя пасяджэнні па пераглядзе рашэння аб утрыманні пад вартай; асуджаныя да пазбаўлення волі не дастаўляюцца на перагляд прысудаў вышэйстаячым судом.

Сістэматычна парушалася прэзумпцыя невінаватасці ў дачыненні да фігурантаў палітычна матываваных крымінальных і адміністрацыйных спраў. Дзяржаўныя органы і супрацоўнікі праўладных інфармацыйных рэсурсаў публікавалі матэрыялы абвінаваўчага характару ў дачыненні да абвінавачаных да таго, як абвінаваўчы прысуд набыў законную моц. Абвінавачаныя дастаўляліся ў судовае пасяджэнне ў кайданках і змяшчаліся ў шкляную ці металічную клетку. Паказальным у гэтым выпадку з'яўляецца судовы разгляд па справе супраць праваабаронцаў **Алеся Бяляцкага**, **Уладзіміра Лабковіча** і **Валянціна Стэфановіча**, калі іх трымалі ў зале суда ў металічнай клетцы і ў кайданках, у дзяржаўных СМІ публікаваліся іх здымкі ў клетцы.

Затрыманыя масава прымушаліся да публічных выбачэнняў і прызнання віны на відэа ("пакаяльныя відэа"). Часцяком прымус да запісу суправаджаецца збіваннямі, у некаторых затрыманых на відэа бачныя гематомы і ранкі. Так, у "пакаяльным відэа" ў затрыманага **Уладзіміра Паўлаўца** на твары можна заўважыць гематому і сінякі. У кожным разе запіс прызнанняў да хаця б фармальнага забеспячэння абаронай і растлумачэння працэсуальных правоў сур'ёзна абмяжоўвае права не сведчыць супраць сябе.

Адвольна абмяжоўваліся магчымасці для падрыхтоўкі сваёй абароны і доступ да адваката. У ізалятарах часовага ўтрымання да затрыманых у межах адміністрацыйных спраў, у карцарах СІЗА абвінавачаным па крымінальных справах і ў штрафных ізалятарах папраўчых устаноў асуджаным не давалі пісьмовыя прыналежнасці для падачы скаргі, не дапускаліся адвакаты.

У СІЗА і папраўчых установах часцяком парушаецца прыватнасць размоваў з адвакатам: былыя палітычныя зняволеныя паведамляюць, што памяшканні для сустрэч не даюць магчымасці канфідэнцыйна кантактаваць і захоўваць прыватнасць. У тых памяшканнях, якія абсталяваныя раздзяляльным шклом, затрыманым і іх адвакатам даводзіцца вельмі гучна размаўляць адно з адным, праз што размову можа чуць персанал установы.

Пазбаўлены волі паводле палітычных матываў шэсць адвакатаў; 128 адвакатаў адвольна пазбаўлены ліцэнзіі. Усё гэта ў сукупнасці з наступствамі ўнясення зменаў у закон, які рэгулюе адвакацкую дзейнасць, істотна аслабіла і без таго ўразлівы стан беларускай адвакатуры. Органы адвакацкага самакіравання адмовіліся ад функцый абароны незалежнасці адвакацкай прафесіі і самі зрабіліся інструментам рэпрэсій, пазбаўляючы іншадумных прадстаўнікоў адвакатуры права на прафесію паводле палітычных матываў. Дзейнасць адвакатуры палітызуецца як вонкавымі суб'ектамі, асабліва — Міністэрствам юстыцыі, гэтак і з уласнай ініцыятывы органаў адвакацкага самакіравання. Яны, дзеля дэманстрацыі лаяльнасці да ўлады, абіраюць палітыку рэпрэсій у дачыненні да адвакатаў, што мысляць прадэмакратычна, з ліку тых, хто прафесійна ажыццяўляе абарону людзей, якіх пераследуюць паводле палітычных матываў.

Па крымінальных справах апеляцыйны перагляд прысудаў, ва ўмовах агулам крытычна малой колькасці пераглядаў прысудаў (у адпаведнасці са статыстычнымі звесткамі Вярхоўнага суда, за 2020–2022 гады ў выніку апеляцыйнага абскарджання былі адменены толькі 1,14% прысудаў і зменены 10,39% прысудаў), не прыводзіць да перагляду палітычна матываваных крымінальных спраў па сутнасці і адмены неправамерных прысудаў. Рашэнні аб змене прысудаў па палітычна матываваных крымінальных справах у асноўнай сваёй масе датычаць толькі выпраўлення тэхнічных недакладнасцяў, дапушчаных судом першай інстанцыі, а часам — узмацнення жорсткасці пакарання.

Праваабаронцы працягвалі дазнавацца пра вядомыя выпадкі крымінальнага пераследу паводле арт. 411 КК "Злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі". Крымінальная адказнасць паводле гэтага артыкула вынікае з факту здзяйснення дысцыплінарных правіннасцяў, за якія зняволеныя ўжо адбылі дысцыплінарнае спагнанне. Такім чынам, ужыванне згаданага артыкула можа ўяўляць сабою парушэнне права не быць двойчы асуджаным ці пакараным за адно і тое ж злачынства. Практыка адвольнага падаўжэння тэрміна пакарання паводле арт. 411 КК і раней, да таго як ён зрабіўся інструментам палітычна матываванага пераследу, крытыкавалася праваабаронцамі. Напрыклад, палітычная зняволеная **Паліна Шарэнда-Панасюк** была ў другі раз асуджаная паводле арт. 411 КК, пасля шматразовых змяшчэнняў у штрафны ізалятар і пераводаў у памяшканне камернага тыпу ў якасці дысцыплінарных спагнанняў.

Крымінальны перaслед паводле абвінавачванняў, звязаных з дзейнасцю арганізацый і груп грамадзян, абвешчаных уладамі экстрэмісцкімі фармаваннямі і тэрарыстычнымі арганізацыямі, ажыццяўлялася за дзейнасць, якая часта рабілася абвінавачанымі задоўга да вынясення рашэння аб прызнанні экстрэмісцкім фармаваннем ці тэрарыстычнай арганізацыяй і такім чынам забароны такой дзейнасці. Гэта наўпрост супярэчыць крымінальнаму закону, які прадугледжвае наўмысны, свядомы характар учынення такога дзеяння, прадугледжанага, напрыклад, арт. 361-2 КК (Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці), паводле якога ўлады выстаўляюць прэтэнзіі тым, хто ахвяраваў грошы на розныя ініцыятывы, і, у залежнасці ад акалічнасцяў, або вымагаюць выплату "кампенсацыі", часта на некалькі парадкаў вышэйшай за пералічаную суму, ці асуджаюць, як правіла, да пазбаўлення волі (вядома толькі тры выпадкі абмежавання волі).

## Свабода асацыяцыі

Грамадска-палітычны сектар стаў адной з першых мішэняў для рэпрэсій пасля згасання вулічных пратэстаў у Беларусі ў 2021 годзе. Гэты працэс выяўляўся ў прыняцці паслядоўных адміністрацыйных мер, накіраваных на знішчэнне арганізацый грамадзянскай супольнасці праз ліквідацыю ці прымус да самаліквідацыі. Лаяльныя праўладныя арганізацыі гэты працэс да 2023 года практычна не закрануў.

Па стане на 1 студзеня 2023 г. у Беларусі было зарэгістравана 15 палітычных партый, 20 прафесійных саюзаў, 2 544 грамадскія аб'яднанні, 44 саюзы (асацыяцыі) грамадскіх аб'яднанняў, а таксама 7 рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў. Гэта вельмі нізкія паказчыкі: напрыклад, у Арменіі на 2,8 млн насельніцтва дзейнічаюць больш за 9 000 НКА, у Грузіі на 3,7 млн — каля 10 000. У Літве на 2,8 млн насельніцтва зарэгістравана больш за 1 800 фондаў і 20 000 асацыяцый, а таксама больш як 12 000 грамадскіх устаноў, частка з якіх з'яўляецца формай рэалізацыі права на асацыяцыю.

З пятнаццаці зарэгістраваных на пачатак 2023 года палітычных партый напярэдадні выбараў у Палату прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы дэпутатаў ліквідавана 12, у тым ліку ўсе апазіцыйныя і некалькі праўладных, якія фактычна не ажыццяўлялі палітычнай дзейнасці; зарэгістравана адна новая партыя — праўладная "Белая Русь".

Згодна са звесткамі Lawtrend, з 2021 года прымусова ліквідаваныя ці знаходзяцца ў працэсе ліквідацыі 960 НКА: 8 асацыяцый, 679 грамадскіх аб'яднанняў, 191 установа, 65 фондаў, 4 прафсаюзы, 1 рэлігійная арганізацыя. Больш за 200 з іх забаронены ў 2023 годзе. Прынялі рашэнне наконт ліквідацыі самастойна 551 НКА (больш за 153 — у 2023 годзе).

Асаблівасць заканадаўства Беларусі палягае ў тым, што дзейнасць незарэгістраваных арганізацый забароненая, а парушэнне гэтага правіла цягне крымінальную адказнасць паводле арт.193-1 КК, які прадугледжвае пакаранне ажно да пазбаўлення волі.

Закон "Аб асновах грамадзянскай супольнасці", які вызначыў паняцце грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, акрэсліў *"прававыя і арганізацыйныя асновы ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і грамадзянскай супольнасці ў мэтах забеспячэння кансалідацыі высілкаў асобы, грамадства і дзяржавы па рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь"*, быў прыняты 14 лютага 2023 г. Законам вызначаныя асноўныя палітызаваныя і ідэалагізаваныя задачы ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і грамадзянскай супольнасці, акрэсленыя формы ўзаемадзеяння паміж імі, у тым ліку "ў асаблівых формах" — у выглядзе ўдзелу ў абранні дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, правядзення *"сустрэч з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, прамых тэлефонных ліній, дыялогавых пляцовак, грамадскіх прыёмных, выязных прыёмаў грамадзян у мэтах збору і выпрацоўкі прапаноў"* для вынясення на абмеркаванне УНС; удзелу ў рэалізацыі рашэнняў УНС. Да суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, якія маюць права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі ў асаблівых формах, аднеслі Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Белая Русь", Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, Грамадскае аб'яднанне "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз жанчын", Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі — традыцыйная пяцёрка верных і адданых уладзе квазіграмадскіх суб'ектаў.

Змены ў Законы "Аб грамадскіх аб'яднаннях" і "Аб палітычных партыях", якімі істотна падвысілі патрабаванні да згаданых суб'ектаў, таксама былі ўнесеныя 14 лютага. Асобныя прагрэсіўныя нормы зменаў не ўплываюць на агульны негатыўны эфект ад іх прыняцця.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу 29 лістапада прыняла новую рэдакцыю Закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях", якая істотна ўскладняе ўмовы стварэння рэлігійных аб'яднанняў. Важнасць магчымасці запачаткоўваць рэлігійныя аб'яднанні палягае ў іх выключным праве ствараць манастыры, манаскія абшчыны, рэлігійныя брацтвы і сястрычаствы, рэлігійныя місіі, духоўныя навучальныя ўстановы, а таксама запрашаць замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства дзеля таго каб займацца рэлігійнай дзейнасцю. Такія абмежаванні правоў вернікаў замахваюцца не толькі на свабоду сумлення, але і на свабоду асацыяцыі.

Асобнай формай парушэння права на асацыяцыю сталася ганебная практыка адвольнага пазасудовага прызнання Міністэрствам унутраных спраў і Камітэтам дзяржаўнай бяспекі суб'ектаў грамадзянскай супольнасці экстрэмісцкімі фармаваннямі. Гэта дае падставу для прыцягнення да крымінальнай адказнасці за іх стварэнне і кіраванне імі, за ўваходжанне ў склад экстрэмісцкага фармавання "ў мэтах здзяйснення злачынства экстрэмісцкай скіраванасці", а таксама за шырока трактаванае "іншае садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці".

За мінулы год такія рашэнні, што непасрэдна замахваюцца на свабоду асацыяцыі, былі прынятыя ў дачыненні да "Кардынацыйнай рады", Беларускай асацыяцыі журналістаў, Рады БНР, "SYMPA", Праваабарончага цэнтра "Вясна", Задзіночання Беларускіх Студэнтаў, "Асацыяцыі беларускага бізнэсу за мяжой", "Dissidentby", шэрагу іншых пратэсных супольнасцяў.

Такім чынам, змены ў законы, ліквідацыя і іншыя формы ціску на НКА абмяжоўваюць права на асацыяцыю, скарачаюць легальныя спосабы вядзення грамадскай і палітычнай дзейнасці.

## Палітычны пераслед за выказванне меркавання. Парушэнне свабоды слова і свабоды мірных сходаў

Прыцягненне да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці за выказванне меркавання замацоўваецца як фармалізаваная ў заканадаўстве практыка знішчэння непажаданых для сістэмы выказаных меркаванняў людзей.

Права на мірныя сходы заклікана забяспечваць людзям выказванне свайго меркавання калектыўна і ўдзельнічаць у грамадскім будаўніцтве. Разам з іншымі сумежнымі правамі яно дазваляе фарміраваць аснову сістэмы дзяржаўнага кіравання з удзелам грамадзян, базай для якой з'яўляюцца дэмакратыя, правы чалавека, вяршэнства права і плюралізм (Заўвагі агульнага парадку № 37 (2020) аб праве на мірныя сходы (артыкул 21). Аднак беларускія ўлады дэманструюць адваротнае: абмяжоўваюць свабоду слова, караюць за альтэрнатыўнае меркаванне, у тым ліку выказаную крытыку, а таксама душаць любыя праявы аб'яднання людзей, калі за імі не стаіць праўладнай ідэалогіі і лаяльнасці да афіцыйнай улады.

У якасці помсты, чысткі і папярэджання масавых пратэстаў усё яшчэ пераследуюцца людзі за арганізацыю і ўдзел у мірных сходах у 2020 годзе. Па сканчэнні трох з паловай гадоў з моманту шырокамаштабных масавых акцый пратэсту па ўсёй краіне ўлады працягваюць караць іх удзельнікаў і ўдзельніц, а менавіта: затрымліваць, ужываць катаванні і іншыя віды жорсткага,

бесчалавечнага і зневажальнага чалавечую годнасць абыходжання і ўзбуджаць супраць іх крымінальныя справы.

З 2020 года было асуджана 1 789 чалавек, абвінавачванні якіх утрымліваюць ч.1 арт. 342 КК. З іх асуджаныя толькі па ч. 1 арт. 342 КК, без іншых абвінавачванняў, якія ўплываюць на выгляд і памер пакарання, 1 588 чалавек. Пазбаўленне волі прызначана ў 244 выпадках (тры — з адтэрміноўкай выканання), абмежаванне волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу — у 264 выпадках, без накіравання — у 672 выпадках, арышт — у пяці выпадках, прымусовае лячэнне — у двух выпадках, штраф — у адным выпадку. Астатнія пакаранні невядомыя. Такім чынам, 43% асуджаных паводле ч. 1 арт. 342 КК пазбаўленыя волі выключна за мірны вулічны пратэст.

Вялікую колькасць палітвязняў улада пераследуе паводле дыфамацыйных артыкулаў, г. зн. нормаў, якія прадугледжваюць пакаранне за крытыку ўлады, яе сімвалаў і атрыбутыкі, абразу службовых асобаў і паклёп у дачыненні да іх.

У адпаведнасці з прынцыпамі 7, 15, 16 Ёханэсбургскіх прынцыпаў, выказванне меркавання, якое не складае пагрозу нацыянальнай бяспецы, уключае, але не абмяжоўваецца выказваннямі:

- за негвалтоўнае змяненне палітыкі ўрада ці змену самога ўрада;
- якія крытыкуюць або абражаюць нацыю/дзяржаву/дзяржаўныя сімвалы/урад/дзяржаўныя ведамствы/дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў/замежныя дзяржавы і іх ўрады.
- супраць прызыву на ваенную службу або ваеннай службы як такой;
- супраць канкрэтнага канфлікту або пагрозы прымянення сілы для вырашэння міжнародных спрэчак;
- накіраваныя на перадачу інфармацыі аб меркаваных парушэннях міжнародных стандартаў правоў чалавека або міжнароднага гуманітарнага права.

Крытыка або абраза, якія накіраваныя на падбухторванне да гвалтоўных дзеянняў ці якія могуць пацягнуць такія дзеянні, пад абарону не падпадаюць. Гэтая акалічнасць прымушае праваабаронцаў асабліва пільна сачыць за абгрунтаванасцю прыцягнення да крымінальнай адказнасці тых, хто абвінавачваецца ў "распальванні варожасці або варажнечы па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці". Аднак праведзены маніторынг дае падставы лічыць, што, як правіла, гаворка ідзе пра дапушчальныя формы выказвання меркавання, а розныя вострыя або правакацыйныя выказванні не носяць характару наўмыснага пераследу пацярпелых групаў толькі па факце іх існавання. Наадварот, гэтыя выказванні з'яўляюцца формамі крытыкі, часам вострай і спрэчнай па форме, за супрацьпраўныя паводзіны такой групы.

З 2020 года было асуджана не менш за 447 чалавек па абвінавачванні ў "распальванні варожасці або варажнечы" (арт. 130 КК), з іх 113 — без іншых абвінавачванняў, якія ўплываюць на выгляд і памер пакарання. Пазбаўленне волі прызначанае ў 89 выпадках, абмежаванне волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу — у двух выпадках, без накіравання — у адным выпадку, астатнія пакаранні праваабаронцам невядомыя. Такім чынам, па арт. 130 КК практычна ўсе асуджаныя пазбаўляюцца волі за крытычныя выказванні.

За той жа перыяд асуджана 691 чалавек па арт. 368 КК за абразу А. Лукашэнкі, з іх 313 — без іншых абвінавачванняў, якія ўплываюць на выгляд і памер пакарання. Пазбаўленне волі

прызначана ў 130 выпадках (адзін — з адтэрміноўкай выканання), абмежаванне волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу — у 50 выпадках, без накіравання — у 40 выпадках, арышт — у васьмі выпадках, прымусовае лячэнне — у чатырох выпадках, штраф — у трох выпадках. Астатнія пакаранні невядомыя. 82% асуджаных паводле арт. 368 КК пазбаўленыя волі выключна за выказванні ў дачыненні да А. Лукашэнкі.

У дэмакратычнай дзяржаве, якая ставіць сваёй найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай чалавека і яго правы (прэамбула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), не можа быць крыміналізаваная дыфамацыя, бо гэта супярэчыць самой сутнасці права на выказванне меркавання.

Дзеючае заканадаўства і актыўная правапрымяняльная практыка па ім накіраваныя на здушэнне любога іншадумства і непрапарцыйнае пакаранне тых, хто адважыўся сказаць, напісаць, зрабіць тое, што з пункту гледжання ўладаў з'яўляецца непажаданым, небяспечным, забароненым і дэструктыўным.

19 ліпеня 2023 года суддзя суда Цэнтральнага раёна Гомеля Віктар Казачак накіраваў на прымусовае лячэнне ў псіхіятрычны стацыянар **Валерыя Яроцкага**, якога абвінавацілі ў паклёпе (арт. 188 КК) і паклёпе на Аляксандра Лукашэнку (ч. 2 арт. 367 КК). Па матэрыялах справы, Яроцкі адправіў у КДБ, МУС, пракуратуру і Цэнтральную камісію па выбарах і рэферэндумах рукапісныя і электронныя лісты, у якіх абвінаваціў Лукашэнку ў цяжкіх злачынствах. Падобныя лісты ён падрыхтаваў і ў дачыненні да аднаго з пракурораў Гомельскай вобласці. Акрамя таго, Віктар быў унесены ў пералік асобаў, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці (гл. Парушэнне права на выказванне меркавання пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам).

**Юрый Мінін** быў затрыманы 18 сакавіка 2023 года за каментары ў тэлеграм-чатах, якія ён нібыта пакінуў яшчэ ў 2020 годзе. За гэта 10 кастрычніка 2023 года суддзя Гродзенскага суда Мікалай Рачынскі прызнаў Юрыя вінаватым у распальванні варожасці і прысудзіў яго да пазбаўлення волі.

**Гняздзілаву Кірылу**, **Прытуленку Канстанціну**, **Карняенка Ганне** і **Цыпаку Андрэю** акрамя абвінавачвання ў распальванні варожасці і варажнечы быў прад'яўлены арт. 203-1 КК (Незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных). Вядома, што трое з іх затрыманыя і пазбаўленыя волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў за адпраўку ў тэлеграм-канал "Чорная кніга Беларусі" асабістых дадзеных людзей, якія, на думку ініцыятывы, датычныя да фальсіфікацыі выбараў, гвалту супраць мірных пратэстоўцаў і рэпрэсій у Беларусі.

У Мінскім гарадскім судзе 18 студзеня 2023 года быў абвешчаны прысуд па першым завочным судзе ў межах "спецыяльнай вытворчасці" па справе "Чорнай кнігі Беларусі": да 12 гадоў калоніі завочна асудзілі **Дзмітрыя Навошу**, а таксама **Яніну Сазановіч**, **Даніїла Багдановіча**, **Валерыю Занямонскую** і **Вольгу Высоцкую**. Пяць чалавек абвінавацілі паводле ч. 3 арт.130 і ч. 3 арт. 203-1 КК. Суд доўжыўся крыху больш за месяц у закрытым рэжыме.

## Пераслед пад выглядам абароны ад пагрозаў нацыянальнай бяспецы

У той час як міжнародныя стандарты падкрэсліваюць, што мірнае ажыццяўленне права на свабоду выказвання меркавання не павінна разглядацца як пагроза нацыянальнай бяспецы або падвяргацца абмежаванням або пакаранню (Заўвагі агульнага парадку № 34), з 2020 года ўлады затрымалі і пазбавілі волі па меншай меры 92 чалавек па арт. 361 КК (Заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь). Сярод іх: **Балонкін Аляксандр**, **Брыцікава Вольга**, **Кухаронак Аляксандр**, **Альховік Юрый** і іншыя.

Большасць палітвязняў улады абвінавачваюць адразу па некалькіх "экстрэмісцкіх" крымінальных артыкулах, што пацвярджае палітычны матыў пераследу, інструментальны характар артыкула ў мэтанакіраваным падаўленні свабоды слова, запалохванні і пакаранні актыўных людзей. Наяўнасць абвінавачвання па арт. 361 КК у прысудзе стварае ўражанне аб законным характары пераследу, аб тым, што асуджаны пазбаўлены волі па канкрэтным законе з пэўнай, хоць і беспрынцыпова шырокай характарыстыкай злачынства.

Між тым, заклікі да санкцый — гэта папярэджанне дзяржаве пра здзейсненыя ім грубыя парушэнні правоў чалавека, гэта таксама пэўныя спробы паўплываць на міжнародныя суб'екты, якія маюць патэнцыял да ціску, закліканага змяніць паводзіны ці палітыкі дзяржавы-парушальніцы. У любым выпадку, любыя выказванні і каментары пра санкцыі з'яўляюцца палітычным меркаваннем і абароненыя артыкулам 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах — правам на свабоднае выказванне меркавання.

6 лютага 2023 года супрацоўнікі ГУБАЗіК затрымалі 65-гадовага бізнэсоўца **Пятра Старацітарава** за рэпосты ў сацыяльнай сетцы Facebook. Пасля затрымання на адным з праўладных Telegram-каналаў з'явілася відэа з удзелам мужчыны, а таксама інфармацыя, што *"затрыманы абражаў прэзідэнта, распальваў сацыяльную варожасць і адкажа адпаведна строгасці закона"*. Суддзя Гомельскага абласнога суда Яўген Шаршнёў кваліфікаваў дзеянні Пятра паводле пяці артыкулаў Крымінальнага кодэкса, у тым ліку паводле арт. 361. Мужчыну таксама абвінавацілі ў абразе і паклёпе ў дачыненні да А. Лукашэнкі, распальванні варожасці або варажнечы, дыскрэдытацыі Беларусі. Суд праходзіў у закрытым рэжыме, у выніку Пятру Старацітараву прызначылі пяць гадоў пазбаўлення волі.

8 чэрвеня 2023 года за каментары ў сацыяльных сетках была затрыманая маці чацвярых дзяцей **Кацярына Джыг**. 27 ліпеня суддзя Мінскага абласнога суда Алена Бачышча асудзіла жанчыну да чатырох гадоў калоніі, прызнаўшы Кацярыну вінаватай ва ўчыненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 3 арт. 361, ч. 2 арт. 367 і ч. 2 арт. 368 Крымінальнага кодэкса.

## Пераслед за крытыку дзяржаўных сімвалаў

Нягледзячы на тое, што дзяржаўныя сімвалы могуць быць аб'ектам крытыкі, якая з'яўляецца выказваннем меркавання, такія дзеянні ў Беларусі крыміналізаваныя арт. 370 КК (Здзек з дзяржаўных сімвалаў). Пры гэтым, дадзены артыкул актыўна ўжываецца з 2020 года, праваабаронцам вядома пра не менш чым 171 вынесены прысуд у перыяд 2020-2023 гг.

Так як дзяржаўныя сімвалы могуць быць падвергнутыя крытыцы і абразам у межах свабоды выказвання меркавання (Ёханэсбургскія прынцыпы), у абвінавачваннях не павінны фігураваць

дзяржаўныя сімвалы ў якасці вызначальнай прыкметы. Суддзі павінны разглядаць не ступень непажаданасці асабістага стаўлення чалавека да дзяржаўных сімвалаў, але ступень парушэння грамадскага парадку або непавагі да грамадства.

У 2023 годзе за "знявагу" сцяга былі пазбаўленыя волі на адзін год **Кандрацьеў Аляксандр**, **Лагун Дзмітрый**, **Барысаў Вадзім** і **Волк Алег**, на паўтара года — **Сінякоў Захар**, **Дубаў Павел** і **Анціпаў Міхаіл**. У прыватнасці, Павел Дубаў асуджаны за тое, што ён у карпаратыўным чаце кампаніі грузаперавозак пакінуў каментар на беларускай мове, у якім патлумачыў, што *"наш сцяг бел-чырвона-белы"*, а цяперашні назваў *"узыход сонца над балотам"*. Характэрна, што мужчына напісаў паведамленне, калі знаходзіўся ў Заходняй Еўропе падчас рэйса, пасля якога вярнуўся ў Беларусь.

**Кузняцоў Елісей**, **Кушняроў Яўген**, **Маляўка Аляксандр**, **Санкоўская Ірына**, **Задойка Сцяпан** і іншыя палітвязні, затрыманыя ў 2023 годзе, абвінавачваліся не толькі ў здзеку з дзяржаўных сімвалаў, але і паводле іншых артыкулаў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія парушаюць правы чалавека.

Так, 24 кастрычніка 2023 года суд Кастрычніцкага раёна Гродна асудзіў Сцяпана Задойку да пяці з паловай гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Сцяпана прызналі вінаватым паводле наступных артыкулаў Крымінальнага кодэкса: ч. 2 арт. 368 (Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады), арт. 370 (Здзек з дзяржаўных сімвалаў), ч. 2 арт. 366 (Гвалт альбо пагроза гвалту ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі, альбо іншай асобы, якая выконвае грамадскі абавязак). Паводле звестак праўладных Telegram-каналаў, мужчына напісаў больш за 1 200 каментароў пераважна на беларускай мове ў YouTube, якія ў асноўным былі накіраваныя на падтрымку Украіны.

## Падаўленне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам

Выказванне альтэрнатыўнага меркавання ўладамі расцэньваецца як праява "экстрэмізму" і "тэрарызму". Пры гэтым, мэты барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам у беларускіх уладаў якасна іншыя, чым у міжнародных арганізацый, якія змагаюцца з тэрарызмам і яго асновай — гвалтоўным экстрэмізмам: гэта барацьба з іншадумствам і пратэснымі выступамі, а таксама жорсткае падаўленне дзеянняў, якія фармальна маюць прыкметы правапарушэнняў, аднак учыненыя з мэтай выказвання грамадска-палітычнай пазіцыі, процідзеяння ўзмацненню патэнцыяла нелегітымнай улады ў адсутнасць магчымасцяў для выказвання меркаванняў іншым шляхам.

Антыэкстрэмісцкае заканадаўства накіравана на метадычнае, сістэмнае і шматузроўневае вынішчэнне незалежнай інфармацыі, на ўстанаўленне і замацаванне цэнзуры і падштурхоўвання да самацэнзуры.

На канец 2023 года ў **пераліку экстрэмісцкіх фармаванняў** налічвалася 169 суб'ектаў, 62 з якіх былі прызнаныя такімі ў 2023 годзе.

Прызнанне арганізацыі або ініцыятывы экстрэмісцкім фармаваннем цягне крымінальную адказнасць для стваральнікаў або кіраўнікоў, а таксама ўсіх датычных да дзейнасці.

У 2023 годзе былі прызнаныя палітвязнямі каля 90 чалавек, у абвінавачванні якіх фігуруюць арт. 361-1, 361-2, 361-4 КК, што прадугледжваюць адказнасць за стварэнне, кіраўніцтва, удзел у экстрэмісцкім фармаванні, фінансаванне і аказанне садзейнічання экстрэмісцкай дзейнасці.

Напрыклад, грамадзянка Украіны **Бруханава Кацярына** была затрыманая пры праходжанні беларускай мяжы. Падчас неправавой практыкі праверкі тэлефона прадстаўнікі праваахоўных органаў убачылі, што 30 сакавіка 2022 года яна адправіла два відэаролікі ў чат-бот рэдакцыі "Зеркало", якая была прызнаная экстрэмісцкім фармаваннем 9 чэрвеня 2023 года. На відэа было зафіксавана перамяшчэнне расійскай вайсковай тэхнікі пад Мінскам, якое зняла сама Кацярына. 13 кастрычніка 2023 года суддзя Андрэй Сіз прызнаў жанчыну вінаватай у "садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці" і асудзіў яе да двух з паловай гадоў пазбаўлення волі. За перасылку паведамленняў у Telegram-бот "Рэдакцыі Nexta", прызнанай экстрэмісцкім фармаваннем, **Коваль Аляксандр** быў асуджаны да двух з паловай гадоў пазбаўлення волі.

У 2023 годзе працягнулася практыка прызнання інфармацыйнай прадукцыі, сімволікі, атрыбутыкі, друкаваных і кніжных выданняў "экстрэмісцкімі матэрыяламі". Усяго ў 2023 годзе беларускімі судамі прынята 888 такіх рашэнняў (для параўнання: у 2022 годзе суды прынялі 637 рашэнняў аб прызнанні матэрыялаў "экстрэмісцкімі"). У мінулым годзе да «экстрэмісцкіх матэрыялаў» аднеслі творы беларускіх аўтараў розных пакаленняў (**Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча**, **Альгерда Бахарэвіча**, **Ларысы Геніюш**, **Уладзіміра Някляева**, **Лідзіі Арабей** і **Наталлі Арсенневай**), песні і кліпы беларускіх гуртоў, незалежныя раённыя газеты, словазлучэнне "Полк Каліноўскага", Telegram-каналы і чаты беларусаў замежжа, стыкеры ў гэтай сацыяльнай сетцы, супольнасці салідарнасці і інш.

За рэпосты, перасылку ў асабістыя паведамленні "экстрэмісцкіх" матэрыялаў, а таксама падпіскі ў сацсетках, дзе яны бачныя іншым карыстальнікам, прадугледжаная адміністрацыйная адказнасць паводле арт. 19.11 КаАП.

Вядома, што да адміністрацыйнай адказнасці па гэтым артыкуле ў 2023 годзе было прыцягнута як мінімум 2 791 чалавек. З іх было арыштавана за распаўсюд "экстрэмісцкіх" матэрыялаў мінімум 342 чалавекі агулам на 6 548 дзён. Аштрафавана было мінімум 254 чалавекі агулам на 10 019 базавых велічынь (370 703 рублёў або 112 260 даляраў). Астатнія вынікі судоў невядомыя, аднак наяўныя дадзеныя даюць магчымасць ацаніць характар пераследу: сярэдняя працягласць арышту — 19 сутак, сярэдні штраф — каля 450 даляраў. Часта ў якасці дадатковага пакарання выкарыстоўваецца канфіскацыя сродка здзяйснення правапарушэння — тэлефона або камп’ютара.

Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь на сваім сайце паведаміў, што толькі ў адной Магілёўскай вобласці за 2023 год было разгледжана 455 спраў за "распаўсюд экстрэмізму". Пры гэтым колькасць разгледжаных спраў па ч. 2 арт. 19.11 КаАП у параўнанні з 2022 годам перавысіла 57%.

Абвінавачванні па арт. 19.11 КаАП сталі ўніверсальным інструментам адвольных рэпрэсій, у тым ліку ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, які нярэдка ўжываецца некалькі разоў запар, напрыклад, за некалькі выяўленых матэрыялаў у сацыяльных сетках. Акрамя таго, судамі паўсюдна ўжываецца прыцягненне людзей да адказнасці па арт. 19.11 КаАП за інфармацыйныя матэрыялы, прызнаныя экстрэмісцкімі, але якія захоўваюцца і не дэманструюцца публічна.

Так, 9 траўня 2023 года пры ўездзе ў Беларусь быў затрыманы **Уладзімір Казека** (пазней прызнаны палітвязнем). Пры неправавой практыцы праверкі тэлефона ў яго выявілі падпіскі на "экстрэмісцкія матэрыялы". У дачыненні да Уладзіміра адбылося тры асобныя судовыя пасяджэнні, на кожным з якіх яму прызначылі арышт. У чэрвені мужчына выйшаў на волю пасля 43 сутак арышту. 28 кастрычніка 2023 года Казеку зноў затрымалі, у яго дома быў праведзены перагрус і пасля чарговай праверкі тэлефона яго абвінавацілі паводле ч. 2 арт. 19.11 КаАП за старыя падпіскі на "экстрэмісцкія матэрыялы". У выніку за 2023 год Уладзімір Казека адбыў арышт агульным тэрмінам у 58 сутак.

**Андрэю Галаварыну** суд Наваполацкага раёна прызначаў 15 сутак арышту пяць разоў запар: у суме ён адбыў пакаранне ў выглядзе 75 сутак адміністрацыйнага арышту. Вядома, што падчас першага затрымання, Андрэй перанёс гіпертанічны крыз.

У 2023 годзе Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь актыўна працягнула папаўняць "Пералік грамадзян Беларусі, замежных грамадзян або асобаў без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці". Насуперак норме Закона "Аб супрацьдзеянні экстрэмізму", у пералік уключаюцца не толькі тыя грамадзяне, у дачыненні да якіх судом вынесены прысуд, але і тыя, хто вызвалены ад крымінальнай адказнасці на падставе пастановы суда, што набыла законную моц, аб спыненні вытворчасці па крымінальнай справе (тры чалавекі ў 2023 годзе).

Пералік, які пачалі весці 23 сакавіка 2022 года, за 2023 год павялічыўся на 1 391 чалавека, і ўсяго утрымліваў на канец года 3 654 пазіцыі. Акрамя грамадзян Беларусі, туды ўнесеныя 62 грамадзяніна РФ, 11 — Казахстана, 10 — Украіны, чатыры — Эстоніі, тры — Латвіі, па два — Германіі, Польшчы, Венгрыі, Азербайджана, Узбекістана, па адным — Літвы, Манголіі, Малдовы, Арменіі.

Уключэнне ў Пералік накладае на чалавека паразы ў правах, дадатковыя да прызначанага судом пакарання. Як правіла, МУС і КДБ уключае ў спіс тых, хто пераследуецца па палітычных матывах, дзе экстрэмісцкі характар дзейнасці вызначаецца ўладай у аднабаковым парадку "за зачыненымі дзвярыма". Падобная практыка дазваляе адвольна прызнаваць непажаданых уладам людзей і арганізацыі "экстрэмісцкімі".

Так, асобам, уключаным у пералік, забараняецца займацца дзейнасцю, звязанай з абаротам наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў, зброі і боепрыпасаў, выбуховых рэчываў; педагагічнай дзейнасцю (у частцы рэалізацыі зместу адукацыйных праграм); выдавецкай дзейнасцю; займаць дзяржаўныя пасады; праходзіць ваенную службу. Акрамя таго, фінансавыя аперацыі (адкрыццё банкаўскага рахунку, разавыя плацяжы, перавод, паступленне, выдача, абмен, унясенне грашовых сродкаў) тых, хто ўключаны ў Пералік, падлягаюць "асабліваму фінансаваму кантролю". На практыцы гэта азначае, што чалавек не можа свабодна карыстацца сваім банкаўскім рахункам, адкрываць новы рахунак і карыстацца ім. Любое выкарыстанне або зняцце грашовых сродкаў з банкаўскага рахунку магчыма толькі ў парадку выключэння па дазволе органа, які ажыццяўляе фінансавы кантроль. Варта адзначыць, што акрамя Закона аб экстрэмізме, абмежаванні на правы асобаў, унесеных у Пералік, замацоўваюць і іншыя нарматыўныя акты. Напрыклад, яны не могуць быць кіраўнікамі і заснавальнікамі рэлігійных арганізацый у адпаведнасці з новай рэдакцыяй Закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях"; на іх не распаўсюдзіў сваё дзеянне Закон "Аб амністыі ў

сувязі з Днём народнага адзінства"; уключэнне заснавальніка СМІ ў Пералік з'яўляецца падставай для анулявання пасведчання аб рэгістрацыі СМІ.

Усе абмежаванні перастаюць дзейнічаць толькі па заканчэнні пяці гадоў пасля пагашэння або зняцця судзімасці.

За 2023 год Камітэт дзяржаўнай бяспекі рэгулярна абнаўляў "Спіс асобаў, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці". На канец мінулага года ў "тэрарыстычным спісе" налічвалася 1 156 чалавек, з іх 397 — беларусы (у спісе КДБ — 1 165 пазіцый, аднак дзевяць чалавек з яго былі выдаленыя раней).

З 2020 года ўлады адвольна асудзілі 50 чалавек па арт. 289 Крымінальнага кодэкса (Акт тэрарызму). Восем з іх затрыманыя пасля атакі на расійскі вайсковы самалёт у Мачулішчах.

Нагадаем, на вайсковым аэрадроме ў гарадскім пасёлку Мачулішчы пад Мінскам 26 лютага 2023 года прагучалі два выбухі. Пазней стала вядома, што быў пашкоджаны расійскі вайсковы самалёт далёкай выведкі ДРЛВ-50, які знаходзіўся на гэтым аэрадроме. Ён выкарыстоўваўся для навядзення расійскіх ракет на цэлі ва Украіне. Пасля таго, што адбылося, па Беларусі прайшла хваля затрыманняў, якую ўлады назвалі "зачысткай". Супрацоўнікі КДБ зладзілі маштабную аперацыю па выкрыцці так званых "дыверсантаў". У дамах дзясяткаў беларусаў праводзілі ператрусы, пасля чаго іх дапытвалі і затрымлівалі. Частку з іх пазней адпусцілі.

Сярод змешчаных пад вартай — **Лапацін Андрэй** і **Лапацін Максім**, сужэнцы **Пілько Анастасія** і **Сычоў Алег**. Жонка і муж **Кучынская Ларыса** і **Кучынскі Аляксандр**, па версіі абвінавачвання, здавалі меркаванаму выканаўцу "дыверсіі" **Мікалаю Швецу** кватэру, а **Сцяпурка Андрэй** нібыта спрыяў пошуку кватэры для яго. Таксама быў затрыманы брат Андрэя — **Сцяпурка Мікіта**.

**Пацэнка Вадзім**, па версіі КДБ, павінен быў здзейсніць дыверсію ў Гродне. На кадрах допыту ён кажа, што яму нібыта паставілі задачу падарваць нафтабазу з дапамогай дрона і выбухоўкі.

Артыкул 289 Крымінальнага кодэкса (Акт тэрарызму) прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу па першай частцы, пазбаўленне волі на тэрмін ад васьмі да дваццаці гадоў са штрафам або без штрафу па другой частцы і пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў са штрафам або без штрафу, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або смяротным пакараннем па трэцяй частцы.

Пры гэтым улады працягваюць узмацняць жорсткасць заканадаўства, робячы яго ўсё больш дастасавальным ва ўмовах палітычных рэпрэсій за рэалізацыю правоў чалавек, уключаючы свабоду слова. 9 сакавіка 2023 года Законам Рэспублікі Беларусь № 256-З былі ўнесеныя змены ў Крымінальны кодэкс, сярод якіх быў дададзены новы артыкул 289-1 (Прапаганда тэрарызму). У адпаведнасці з заўвагай да гэтага артыкула, "*пад прапагандай тэрарызму разумеецца распаўсюджванне ў любой форме матэрыялаў і (або) інфармацыі ў мэтах фарміравання ў індывідуальна-нявызначанага кола асоб прыхільнасці да тэрарыстычнай ідэалогіі альбо прызнання тэрарыстычнай дзейнасці дапушчальнай*".

## Пераслед за праяву салідарнасці і дапамогі

Створаная ўладамі сістэма рэпрэсій прадэманстравала сваю інструментальнасць пры падаўленні любога шырокага спектру грамадскай актыўнасці і стварэння атмасферы страху. Напрыклад, асобным вектарам рэпрэсій у 2023 годзе стала праяўленая салідарнасць.

У 2023 годзе ўладамі працягнуўся пераслед грамадзян паводле арт. 361-2 КК "Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці". Пакаранне па дадзеным артыкуле прадугледжвае пазбаўленне або абмежаванне волі ад трох да пяці гадоў са штрафам або без яго. Пры гэтым прыцягненне да крымінальнай адказнасці мае месца і ў выпадках, калі на момант пералічэння сродкаў арганізацыя не мела статус "экстрэмісцкай".

Паводле арт. 361-2 КК за ахвяраванні ініцыятывам, прызнаным экстрэмісцкімі, былі асуджаныя: **Клімаў Кірыл** да чатырох гадоў пазбаўлення волі за данаты "By_help", "BYSOL", "Сумленныя людзі"; **Сацюк Ігар** — да пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі (тэрмін невядомы); **Юрэня Віталь** — да трох гадоў пазбаўлення волі; **Рыбіна Вольга** — да трох гадоў пазбаўлення волі.

Распаўсюджаная практыка, калі супрацоўнікі КДБ і МУС прымушаюць затрыманых напісаць прызнанне аб пералічэнні грошай у розныя "экстрэмісцкія" фонды і арганізацыі, а пасля пералічыць "дабрачынную дапамогу" на рахунак дзяржаўных устаноў у суме, памер якой на парадкі перавышае першапачатковае ахвяраванне. Альтэрнатывай становіцца ўзбуджэнне крымінальнай справы аб фінансаванні экстрэмісцкай дзейнасці. У выпадку выканання дадзеных патрабаванняў крымінальныя справы сапраўды не ўзбуджаюць, аднак няма гарантый таго, што рашэнні ў далейшым не будуць перагледжаныя.

Страх пераследу за данаты стрымлівае людзей ад свядомага ўдзелу ў грамадскім жыцці, ва ўзаемадапамозе, падтрымцы адзін аднаго, а таксама ў адстойванні правоў чалавека, сацыяльнай справядлівасці і дэмакратычных каштоўнасцяў. Такім чынам, пераслед за ахвяраванні акрамя іншых відавочных мэтаў мае на мэце раз'яднаць і знішчыць грамадзянскую супольнасць.

5 чэрвеня 2023 года быў затрыманы **Гормаш Яўген** — чалавек, якога іншыя людзі "адбілі" ад затрымання на пікеце па зборы подпісаў 31 траўня 2020 года пасля таго, як той крыкнуў супрацоўнікамі ДАІ "Ганьба! ". У дачыненні да Яўгена ўсё ж такі была вынесеная пастанова аб адміністрацыйным правапарушэнні з накладаннем спагнання ў выглядзе штрафу, ён сабраў на яго грошы з дапамогай краўдфандынгу. Таксама Яўген планаваў перавесці частку сумы на дапамогу іншым затрыманым на акцыях у падтрымку **Сяргея Ціханоўскага**. Мінскі гарадскі суд прызнаў Яўгена Гормаша вінаватым паводле ч. 1 арт. 342, ч. 3 арт. 361-1 і ч. 1 арт. 369 Крымінальнага кодэкса, рашэнне суда праваабаронцам невядома.

Акрамя таго, многія грамадска-значныя ініцыятывы і рэсурсы, звязаныя з салідарнасцю і дапамогай пацярпелым ад палітычных рэпрэсій у Беларусі прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі або фармаваннямі, што цягне за сабой юрыдычную адказнасць для іх ствaральнікаў, усіх датычных і неабыякавых. Сярод такіх, група ў Facebook "Лісты салідарнасці Беларусь 2020"; сайт і Instagram-старонка ініцыятывы Politzek.me, мноства інфармацыйных рэсурсаў Праваабарончага цэнтра "Вясна", Telegram-чаты "Акрэсціна затрыманыя", "Гомель за Мікіту Залатарова", "Салідарнасць Івацэвічы", фонды BYSOL, By_Help і інш.

## Пераслед за антываенную пазіцыю

Адным з відаў антываеннага супраціву з'яўляецца актыўнасць у Інтэрнэце. Беларускія ўлады ў 2023 годзе працягнулі пераслед тых беларусаў, якія фатаграфуюць калоны расійскай вайсковай тэхнікі і перадаюць інфармацыю ў праект маніторынгу вайсковай актыўнасці "Беларускі Гаюн" або незалежным СМІ. Праз тое, што амаль усе папулярныя недзяржаўныя медыя прызнаныя "экстрэмісцкімі фармаваннямі", беларускія ўлады расцэньваюць перадачу ім звестак, як "садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці" (арт. 361-4 КК), удзел у экстрэмісцкім фармаванні (арт. 361-1 КК) або нават здраду дзяржаве (арт. 356 КК). Усім тым, хто паведамляе аб перамяшчэнні расійскіх вайскоўцаў, пагражае па арт. 361-4 КК ад двух да шасці гадоў пазбаўлення волі. За здраду дзяржаве — ад 7 да 15 гадоў зняволення.

Палітзняволенага праграміста **Дзмітрыя Маставога** затрымалі 26 лютага 2023 года пасля падрыву расійскага вайсковага самалёта на аэрадроме ў Мачулішчах. У прапагандысцкім фільме "Гаспар на сувязь не выйшаў", які выпусцілі неўзабаве пасля затрымання Дзмітрыя, распавялі, што мужчына нібыта прапаноўваў "Беларускаму Гаюну" перадаваць інфармацыю аб аэрадроме Мачулішчы: ён наладзіў трансляцыю з камп’ютара, якая ішла два тыдні без перапынку. У выніку Дзмітрыя абвінавацілі ў здрадзе дзяржаве (ч. 1 арт. 357 КК), садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці (ч. 1 арт. 361-4 КК) і асудзілі на 10 гадоў калоніі.

У кастрычніку 2022 года супрацоўнікі міліцыі затрымалі шасцярых мужчын, больш чым праз год, пасля таго як у Мінску на апоры лініі электраперадач яны вывесілі бел-чырвона-белы сцяг і сцяг Украіны, а ў Telegram-канале Антона Матолькі, прызнаным экстрэмісцкім, на наступны дзень з'явілася фатаграфія сцягоў з подпісам: *"Минчане поздравляют украинский народ с чудесными новостями с крымского моста. Крим — це Україна! Жыве Беларусь! Слава Україні!"*. **Грынько Віктар**, **Несцярэнка Юрый**, **Цікач Ігар**, **Цяпцееў Ігар**, **Савельеў Уладзімір** былі затрыманыя па падазрэнні ў здзяйсненні хуліганства, а 15 чэрвеня 2023 года суддзя Мінскага гарадскога суда Вера Галаўкова вынесла ім прысуды па некалькіх артыкулах, уключаючы арт. 361-2 і арт. 361-4 КК.

З 2020 года не менш за 25 чалавек былі затрыманыя і пазбаўленыя волі на падставе арт. 361-3 Крымінальнага кодэкса (Удзел ці падрыхтоўка да ўдзелу грамадзяніна Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі замежнай дзяржавы ў ваенных дзеяннях без упаўнаважання дзяржавы). Падставай для пераследу па дадзеным артыкуле звычайна з'яўляецца грашовае ахвяраванне на дзейнасць "Палка імя Кастуся Каліноўскага". Сярод іх — **Ганчароў Аляксандр**, **Кананові́ч Чэслаў**, пазбаўлены волі на пяць гадоў, **Чаравака Георгій**, **Райчонак Леанід**, пазбаўлены волі на шэсць гадоў.

За грашовыя ахвяраванні і фатаграфаванне вайсковай тэхнікі **Макееў Дзмітрый** Гомельскім абласным судом быў асуджаны да пазбаўлення волі на шэсць гадоў.

Гомельскі абласны суд 9 студзеня 2023 года асудзіў **Яцэнку Уладзіслава** і **Плакушчава Кірыла** да пазбаўлення волі тэрмінам на пяць гадоў у калоніі ўзмоцненага рэжыму і паўтара года ў калоніі агульнага рэжыму адпаведна. Паводле матэрыялаў справы, адзін з хлопцаў неаднаразова размяшчаў у сацсетцы публікацыі з заклікам да ўдзелу ў батальёне Кастуся Каліноўскага, "Азове" і іншых фармаваннях Узброеных Сіл Украіны. Таксама Уладзіслаў перавёў 21 еўра для батальёна Кастуся Каліноўскага, а абодвух хлопцаў абвінавацілі ў тым, што яны наносілі цынічныя надпісы і малюнкі на сцены будынкаў у абласным цэнтры.

Сярод тых, хто асуджаны за жаданне ваяваць на баку Украіны: **Сяргей Грыбовіч**, **Андрэй Раптуновіч**, **Анатоль Міхайлаў**, **Андрэй Маслаў**, **Міхаіл Лістападаў**, **Яўген Карпаў**, **Сяргей Вайцюк**, **Аляксандр Айнутдзінаў**, **Кірыл Балаханаў**, **Павел Абозны**, **Ян Папковіч**, **Максім Стасюк**, **Васіль Якімаў**

### Перaслед журналістаў, супрацоўнікаў СМІ і блогераў

Працэс знішчэння незалежных СМІ ў Беларусі і спробы татальнага абмежавання дзейнасці беларускіх СМІ за мяжой не спыняліся цягам 2023 года: у журналістаў праходзіліператрусы, іх затрымлівалі, СМІ аб'яўляліся экстрэмісцкімі фармаваннямі, журналісты і супрацоўнікі медыя прыцягваліся да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці. Паводле звестак БАЖ, на канец снежня ў месцах пазбаўлення волі ўтрымлівалася 32 журналісты і супрацоўнікі медыя.

У Светлагорску паводле абвінавачвання ў стварэнні экстрэмісцкага фармавання былі затрыманыя супрацоўніцы тэлеканала "Ранак". Тэлеканал быў прызнаны экстрэмісцкім фармаваннем, як мяркуецца, з-за паведамлення аб гібелі людзей ад выбуху на цэлюлозным заводзе.

У пачатку снежня стала вядома пра шэраг затрыманняў у Магілёве, звязаных з дзейнасцю медыя-рэсурсаў 6TV.by і "Магілёў медыя". Сярод затрыманых — былы дырэктар музея гісторыі Магілёва **Аляксей Бацюкоў**. У журналіста **Андрэя Вырвіча** прайшоў ператрус, у выніку якога была канфіскаваная тэхніка і мабільныя тэлефоны, а сам ён быў дапытаны.

7 сакавіка стала вядома, што Камітэтам дзяржбяспекі "Беларуская асацыяцыя журналістаў" прызнаная экстрэмісцкім фармаваннем. У склад экстрэмісцкага фармавання КДБ уключыў групу «грамадзян з ліку прадстаўнікоў няўрадавай грамадскай арганізацыі "Беларуская асацыяцыя журналістаў"», а таксама **Андрэя Бастунца**, **Алега Агеева**, **Барыса Гарэцкага**, **Вольгу Хвоін**, **Аліну Суравец**, **Аляксандра Старыкевіча**, **Зою Лукашук**, **Сяргея Комлача**.

15 сакавіка ў доме галоўнага рэдактара "Рэгіянальнай газеты" **Аляксандра Манцэвіча** ў Вілейцы прайшоў ператрус. "Рэгіянальная газета" — вядучае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне Маладзечна і рэгіёна. У 2022 годзе ўлады прызналі матэрыялы яго сайта «экстрэмісцкімі матэрыяламі», з таго часу выданне выходзіць у сацыяльных сетках. Аляксандра Манцэвіча абвінавацілі ў дыскрэдытацыі Рэспублікі Беларусь паводле арт. 369-1 Крымінальнага кодэкса. У лістападзе паводле рашэння суда яму прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на чатыры гады ў папраўчай калоніі і штрафу ў памеры 14 800 беларускіх рублёў.

У Мінску 17 сакавіка абвясцілі прысуд галоўнай рэдактарцы TUT.BY **Марыне Золатавай** і дырэктарцы ТАА "ТУТ БАЙ МЕДЫЯ" **Людміле Чэкінай**. Марыну Золатаву прызналі вінаватай у *"распаўсюдзе матэрыялаў з публічнымі заклікамі да захопу дзяржаўнай улады, гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу, заклікамі, звернутымі да замежных дзяржаў, замежных і міжнародных арганізацый, да дзеянняў на шкоду нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, учыненых з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі і сеткі Інтэрнэт» і «наўмысных дзеяннях, накіраваных на ўзбуджэнне сацыяльнай варожасці і варажнечы па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці, здзейсненых групай асобаў"*. Ёй прызначылі 12 гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі. Людмілу Чэкіну прызналі вінаватай ва *"ўхіленні ад выплаты*

*падаткаў"*, а таксама ў *"арганізацыі распаўсюду матэрыялаў з публічнымі заклікамі да захопу дзяржаўнай улады, гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу, заклікамі, звернутымі да замежных дзяржаў, замежных і міжнародных арганізацый, да дзеянняў на шкоду нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, учыненых з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі і сеткі Інтэрнэт"* і *"арганізацыі дзеянняў, накіраваных на ўзбуджэнне сацыяльнай варожасці і варажнечы па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці, здзейсненых групай асобаў".* Пакаранне — 12 гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі.

У Мінскім гарадскім судзе 23 сакавіка асудзілі палітзняволенага журналіста **Генадзя Мажэйку** паводле ч. 1 арт. 368 (Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) і ч. 1 арт. 130 (Распальванне іншай сацыяльнай варожасці) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Таццяна Фалькоўская прызначыла Генадзю тры гады пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Мажэйка — аўтар матэрыялу ў "Камсамольскай праўдзе ў Беларусі" пра **Андрэя Зельцэра**, які загінуў у перастрэлцы з супрацоўнікам КДБ. Паводле тэксту абвінавачвання, *"Генадзь Мажэйка, выяўляючы амаральную цікавасць да экстрэмісцкай дзейнасці, з'яўляючыся яе прыхільнікам, дзейнічаючы паводле матываў палітычнай і ідэалагічнай варожасці, у перыяд з 23 чэрвеня 2020 года па кастрычнік 2021 года здзейсніў шэраг злачынстваў"*. Дзяржабвінавачанне працытавала выказванні палітвязня пра Лукашэнку: *"З аўтаматам бегаць [...] хіба можа нармальны чалавек з аўтаматам бегаць [...] гэта памяшаны вырадак".*

Журналісты **Павел Падабед** і **Вячаслаў Лазараў**, якія працавалі з незалежнымі СМІ, былі ўзятыя пад варту паводле абвінавачвання паводле ч. 1 арт. 364-1 Крымінальнага кодэкса (Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці), у сувязі з чым праваабарончая супольнасць выступіла з заявай з патрабаваннем іх неадкладнага вызвалення. За супрацоўніцтва з тэлеканалам "Белсат" Павел Падабед быў асуджаны да чатырох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Вячаслава Лазарава ў закрытым судовым пасяджэнні асудзілі да пяці з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі, а яго жонку, палітзняволеную **Таццяну Пыцько**, — да трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі. Пазней Т. Пыцько па выніках разгляду апеляцыйнай скаргі знізілі пакаранне і вызвалілі.

Былі вынесеныя прысуды па справе ў дачыненні да каманды апазіцыйнага медыя Nexta, які складаецца з сеткі Telegram-каналаў. Паводле дзяржаўных медыя, абвінавачаным інкрымінавалася здзяйсненне не менш за 1 586 эпізодаў злачынстваў і выстаўлены пазоў аб пакрыцці маёмаснай шкоды на агульную суму больш за 30 мільёнаў рублёў (каля 1 189 000 даляраў). Абвінавачаным прысудзілі ад 8 да 20 гадоў пазбаўлення волі. У дачыненні да **Сцяпана Пуціла** і **Яна Рудзіка** прысуд быў вынесены завочна.

**Аляксандр Гурнік**, аўтар блога ў TikTok "Беларусь у акне", у якім ён публікаваў гумарыстычныя каментары адносна беларускіх навінаў, быў асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі за ўдзел у мірных сходах 2020 года (арт. 342 КК), заклікі да санкцый у дачыненні да Беларусі (арт. 361 КК) і абразу Аляксандра Лукашэнкі (арт. 368 КК).

**Яўген Меркіс**, журналіст-фрылансер і краязнаўца, які асвятляў мірныя сходы 2020 года, быў асуджаны ў закрытым судовым пасяджэнні да чатырох гадоў пазбаўлення волі. Вядома толькі, што яму былі прад'яўленыя абвінавачванні ў стварэнні экстрэмісцкага фармавання альбо ва ўдзеле ў ім (ч. 3 арт. 361-1 КК), а таксама ў садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці (ч. 1 і 2 арт. 361-4 КК).

Палітзняволенага журналіста **Паўла Мажэйку** асудзілі на шэсць гадоў пазбаўлення волі па ч. 2 арт. 361-4 КК (Іншае садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці, здзейсненае паўторна, групай асобаў па папярэдняй змове) за перадачу інфармацыі тэлеканалу "Белсат".

У Гомельскім абласным судзе 31 жніўня вынесены жорсткі прысуд журналістцы і культурнай дзеячцы **Ларысе Шчыраковай**. Яе абвінавацілі паводле арт. 369-1 КК (Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь), ч. 1 і ч. 2 арт. 361-4 КК (Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці і тое ж дзеянне, якое ажыццяўляецца паўторна). Судовы працэс праходзіў у закрытым рэжыме. Суддзя Мікалай Доля прызнаў Ларысу Шчыракову вінаватай і прызначыў ёй тры з паловай гады пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Палітзняволеная разлучаная з непаўналетнім сынам.

## Катаванні, жорсткае, бесчалавечнае, зневажальнае абыходжанне

Катаванні і забароненае абыходжанне зрабіліся неад'емным элементам паўсядзённай практыкі сілавых ведамстваў і застаюцца інструментам прыгнёту і запалохвання ахвяраў рэпрэсій. У створаным становішчы ўжо не ідзе гаворкі пра магчымасць прыцягнення да адказнасці асобаў, вінаватых у шырокамаштабных катаваннях і іншых вельмі грубых парушэннях правоў чалавека ў жніўні 2020 года. Гэтыя парушэнні працягваюцца ў меншых бачных маштабах, чым у 2020 годзе, іншымі метадамі і ў іншых формах, і не паказваюць тэндэнцыі і перспектываў да спынення.

Офіс Упраўлення Вярхоўнага камісара па правах чалавека ААН 17 сакавіка апублікаваў даклад "Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх": *"сабраная інфармацыя пацвярджае маштабы і характэрную схему парушэнняў, выяўленых у папярэдніх дакладах Вярхоўнага камісара, а таксама іх шырокамаштабны і сістэматычны характар. У святле вышэйпададзенай інфармацыі, прадстаўленай у гэтым дакладзе, Вярхоўны камісар мае разумныя падставы меркаваць, што ў перыяд з 1 траўня 2020 года па 31 снежня 2022 года ў Беларусі быў здзейснены шэраг парушэнняў міжнароднага права ў галіне правоў чалавека. Да іх адносяцца адвольнае пазбаўленне права на жыццё і свабоду, катаванні і жорсткае абыходжанне, у тым ліку сэксуальны гвалт, адмова ў праве на належную прававую працэдуру і справядлівы судовы разгляд, адвольная адмова ў праве на ўезд ва ўласную краіну, парушэнні права на свабоду выказвання меркаванняў, мірных сходаў і асацыяцый і на роўную абарону закона. Некаторыя з парушэнняў могуць таксама прыраўноўвацца да злачынстваў супраць чалавечнасці, як тыя вызначаныя ў міжнародным звычайным праве, калі такія дзеянні ажыццяўляюцца ў межах шырокамаштабнага ці сістэматычнага нападу на любых грамадзянскіх асобаў, і калі такі напад здзяйсняецца свядома"*.

Вярхоўны камісар рэкамендаваў дзяржавам-сябрам працаваць над прыцягненнем да адказнасці з дапамогай разгляду ў нацыянальных судах на аснове агульнапрынятых прынцыпаў экстэрытарыяльнай і ўніверсальнай юрысдыкцыі, у залежнасці ад акалічнасцяў і ў адпаведнасці з міжнародным правам, і паралельна вывучаць далейшыя мэтанакіраваныя захады супраць меркаваных вінаватых у сур'ёзных парушэннях правоў чалавека.

"Вясна" працягнула сваю дзейнасць у якасці сузаснавальніцы Міжнароднай платформы падсправаздачнасці Беларусі (IAPB), што ўяўляе сабой кааліцыю незалежных няўрадавых арганізацый, якія згуртавалі свае высілкі дзеля збору, кансалідацыі, праверкі і захавання

доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія ўяўляюць сабой злачынствы паводле міжнароднага права, здзейсненыя беларускімі ўладамі ў 2020-м і наступных гадах.

Працягваюць паступаць трывожныя звесткі пра палітычных зняволеных, якія маюць сур'ёзныя праблемы са здароўем. Анкахворы 66-гадовы кіраўнік Партыі БНФ **Рыгор Кастусёў** распавёў у лісце пра пагаршэнне свайго стану і пра тое, што яму не паведамляюць вынікі апошняга абследавання. У **Паўла Кучынскага**, які пакутуе ад анкалогіі, прагрэсуе хвароба, ва ўмовах зняволення ён пазбаўлены магчымасці прайсці неабходнае лячэнне — перасадку касцянога мозгу. Палітвязень з інваліднасцю **Уладзімір Гундар**, у якога раней у СІЗА адабралі пратэз і якога прыводзілі ў пасяджэнне суда ў адных майтках, у Турме № 4 не можа перасоўвацца і выходзіць на шпацыры праз тое, што на мыліцах сцерліся гумовыя наканечнікі і няма магчымасці іх замяніць. **Таццяна Канеўская**, пераведзеная на турэмны рэжым, мае праблемы з пазваночнікам і апошнім часам сутыкнулася з блакаваннем ліставання, а таксама абмежаваннем спатканняў з сям'ёй.

Вызваленая пасля адбыцця пакарання **Ганна Вішняк** заявіла пра катаванні падчас затрымання і расследавання справы, а таксама пра жорсткае абыходжанне з палітзняволенымі.

Вызвалены палітвязень **Віталь Жук** распавёў "Вясне" пра ўмовы, у якіх утрымліваюць палітвязняў у ПК № 2, а таксама пра ўмовы ў ШІЗА і памяшканні камернага тыпу.

Праваабарончы цэнтр "Вясна" сабраў сведчанні жорсткіх умоваў утрымання палітзняволеных жанчын і ціску на іх з боку адміністрацыі гомельскай калоніі.

"Вясна" распавяла, як улады пераследуюць 27-гадовага палітвязня **Дзмітрыя Кубарава** і як нечалавечыя ўмовы ў ШІЗА і ПКТ адбіліся на ягоным здароўі.

Вызваленыя палітзняволеныя працягвалі паведамляць "Вясне" інфармацыю пра катаванні, жорсткае, зневажальнае, бесчалавечнае абыходжанне. Людзей збівалі пры затрыманні, у службовых аўтамабілях, у Турме № 8 у г. Жодзіна, размяшчалі ў ізалятарах ва ўмовах скучанасці, разам з бяздомнымі людзьмі, якія не прайшлі санітарную апрацоўку. У прыватнасці, адзін з былых палітвязняў утрымоўваўся ў ліку 28 чалавек у чатырохмясцовай камеры ў ізалятары часовага ўтрымання і з двухразовым перавышэннем колькасці зняволеных над колькасцю спальных месцаў — у СІЗА.

У папраўчай калоніі № 24 у Зарэччы сярод асуджаных-рэцыдывістак утрымліваюць трох палітзняволеных: **Алену Маўшук**, **Паліну Шарэнду-Панасюк** і **Вікторыю Кульшу**. Увесь час знаходжання ў гэтай калоніі жанчынам стваралі невыносныя ўмовы і рэгулярна змяшчалі ў штрафны ізалятар. Былыя зняволеныя называюць умовы ўтрымання нечалавечымі. Палітзняволеных пазбаўляюць спатканняў і перадач, а лісты ад сваякоў знішчаюць. Вікторыя Кульша некалькі разоў правяла галадоўку на знак пратэсту супраць адвольнага ціску з боку адміністрацыі.

Праваабаронцам ПЦ "Вясна" стала вядома пра выпадкі рэпрэсій і бесчалавечнага стаўлення з боку адміністрацыі калоніі да зняволеных жанчын у Папраўчай калоніі № 4 у г. Гомелі.

Адзін з былых зняволеных распавёў "Вясне" пра катаванні і здзекі з асуджаных паводле палітычных матываў у папраўчай калоніі № 17, пра вядомыя яму акалічнасці смерці **Вітольда Ашурка** і ціск на **Паўла Севярынца**.

Ад былых зняволеных і абвінавачаных стала вядома пра існаванне ў СІЗА-1 так званай прэс-хаты — камеры, дзе з дапамогай зняволенага, які супрацоўнічае з адміністрацыяй, ствараецца ціск на палітвязняў. Праверкі ў СІЗА-1 суправаджаюцца жорсткімі вобшукамі ў камерах і збіваннямі зняволеных.

Працягваецца практыка запісу зневажальных відэа з прызнаннямі затрыманых за пратэсты і іншадумства. Так, ГУБАЗіК за ўдзел у пратэстах затрымаў двух жыхароў Мінска. Падчас затрымання аднаго з іх паставілі на калені, надзелі кайданкі, загарнулі ў БЧБ-сцяг, на галаву паклалі прэзерватывы, а ў майткі — фалаімітатары.

Часцяком прымус да запісу суправаджаецца збіваннямі: у некаторых затрыманых на відэа бачныя гематомы і ранкі. Так, у "пакаянным відэа" ва Уладзіміра Паўлаўца на твары заўважная гематома і сінякі.

Згодна з інфармацыяй праваабаронцаў "Вясны", палітзняволеную актывістку Паліну Шарэнду-Панасюк збілі у Папраўчай калоніі № 24. Паводле слоў былой зняволенай, якая бачыла Паліну напрыканцы чэрвеня ў СІЗА на Валадарскага, у "яе было пабітае пераноссе і былі бачныя два фінгалы" — гэта зрабілі іншыя зняволеныя, якіх да Паліны падсадзіла адміністрацыя папраўчай калоніі. Акрамя таго, муж палітзняволенай Андрэй Шарэнда распавёў, што ў чэрвені ёй выклікалі хуткую дапамогу, на некаторы час Паліну адпраўлялі ў санчастку. На ягоную думку, жонка магла быць збітая менавіта ў гэты час. Пазней Паліна Шарэнда-Панасюк пацвердзіла гэтыя факты ў судовым пасяджэнні.

Падчас вобшуку 13–14 ліпеня ў плябані мінскага архікафедральнага касцёла сілавікі збівалі ксяндзоў, якія апынуліся там у момант іх прыходу. У аднаго з ксяндзоў застаўся сіняк на твары. Згодна з інфармацыяй "Хрысціянскай візіі", факты збівання святароў мелі месца і раней, аднак служыцелі не былі гатовыя рабіць гэтую інфармацыю публічнай ці распавядаць дэталі здарэння.

У ноч з 24 на 25 красавіка 2023 года былога кандыдата на пасаду прэзідэнта Беларусі — палітзняволенага **Віктара Бабарыку** — даставілі ў гарадскую лякарню з наваполацкай калоніі № 1, дзе ён адбывае 14-гадовы тэрмін. У лякарні яго пратрымалі некалькі дзён і вярнулі ў калонію. Пазней стала вядома, што палітвязня перавялі ў памяшканне камернага тыпу (ПКТ). Праваабаронцы "Вясны" дазналіся падрабязнасці інцыдэнту. Віктар Бабарыка быў дастаўлены у хірургічнае аддзяленне Наваполацкай гарадской лякарні моцна збітым, ягонае лячэнне адбывалася пад кантролем спецслужбаў.

Забароненае абыходжанне набывае нечаканыя формы: сілавікі прымушаюць беларусаў пазбаўляцца ад пратэсных тату. Жыхара Камянца прымусілі змяніць тату з гербам "Пагоня" на шыі. Праўладны Telegram-канал апублікаваў "пакаяльнае" відэа, дзе хлопец "прызнаецца" ў тым, што мае некалькі тату з тэкстам "ACAB", а таксама — тату з выявай "Пагоні" на шыі, і абавязваецца іх "звесці ці перакрыць". Пазней з'явілася новая публікацыя: на здымку відаць, што ўсе тату, у тым ліку "Пагоня", перабіты зверху новымі. У сваім каментары сілавікі адзначылі, што хлопец зрабіў гэта адразу ж пасля вызвалення з ІЧУ.

ГУБАЗіК прымусіў затрыманую дзяўчыну "выправіць татуіроўку апазіцыйнага характару". Гаворка ідзе пра сімвал дэмакратычнага руху ў 2020 годзе — сэрца, кулак і знак V (Victory). На "пакаяльным" відэа дзяўчыну прымусілі сказаць, што яна "больш не прытрымваецца ніякіх палітычных поглядаў, чаго і іншым зычыць".

Паведамлялася, што, пасля таго як ідэолагам на заводзе "Нёман" у Бярозаўцы быў прызначаны былы супрацоўнік КДБ, там адбыўся шэраг жорсткіх затрыманняў. Каля дзесяці працаўнікоў былі паказальна затрыманы з АМАПам на працоўным месцы, пасля чаго іх адправілі працаваць на звалку. Супрацоўнікі скардзіліся на маленькія заробкі, а таксама на адмову ў адпачынку, пасля чаго і адбыліся затрыманні.

### Права на жыццё. Праблема смяротнага пакарання

У адпаведнасці з заўвагай агульнага парадку № 36 КПЧ: *"Права на жыццё мае вырашальнае значэнне як для асобных асобаў, так і для грамадства ў цэлым. Яно само па сабе з'яўляецца самым каштоўным правам, уласцівым кожнаму чалавеку, але яно таксама ўяўляе сабой адно з асноўных правоў, эфектыўная абарона якога з'яўляецца неабходнай умовай для ажыццяўлення ўсіх іншых правоў чалавека і змест якога можа напаўняцца з дапамогай іншых правоў чалавека".* Артыкул 6 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах утрымлівае права грамадзян не падвяргацца дзеянням або бяздзейнасці, якія маюць на мэце або чакана могуць выклікаць іх ненатуральную або заўчасную смерць, а таксама права на годнае жыццё, без якога б там ні было адрознення, уключаючы асобаў, якія падазраюцца або асуджаныя ў сувязі з нават самымі цяжкімі злачынствамі.

Стаўшы на шлях расправы з апанентамі рэжыму, улады як мінімум абыякава ставяцца да верагоднасці смерці пазбаўленых волі людзей з інваліднасцю і цяжкімі захворваннямі, пажылых і аслабленых людзей. З улікам паступаючых звестак пра недахопы медыцынскага абслугоўвання і дэманстратыўныя ўжыванні да такіх людзей асабліва жорсткіх у сілу іх фізічнага стану адвольных мераў дысцыплінарнага характару (у выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар, памяшканне камернага тыпу, турму), можна казаць аб свядомым дапушчэнні прадстаўнікамі ўлады на розных узроўнях гібелі асобных палітвязняў, а таксама аб наўмысным стварэнні ўмоў для гэтага.

5 траўня 2023 года ў папраўчай калоніі № 3 памёр палітвязень **Мікалай Клімовіч**, асуджаны па артыкуле 368 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь за абразу А. Лукашэнкі. Мужчына меў інваліднасць II групы з-за захворвання сардэчна-сасудзістай сістэмы, за год да зняволення перанёс інсульт і складаную аперацыю на сэрцы. Нягледзячы на наяўнасць у Мікалая Клімовіча названага захворвання і пры наяўнасці альтэрнатыўных відаў пакарання, не звязаных з пазбаўленнем волі, суддзя суда Пінскага раёна і горада Пінска Андрэй Бычыла прызначыў яму пакаранне ў выглядзе аднаго года пазбаўлення волі, а Брэсцкі абласны суд пакінуў у сіле прысуд суда першай інстанцыі. Мікалая Клімовіча асудзілі за рэакцыю ў "Аднакласніках" на карыкатуру на Лукашэнку.

11 ліпеня 2023 года стала вядома, што палітзняволены беларускі мастак **Алесь Пушкін** памёр у рэанімацыі бальніцы. Паведамлялася, што ў выніку несвоечасовага аказання медыцынскай дапамогі ў яго развіўся перытаніт, быў сэптычны стан і паліорганная недастатковасць. Алесь Пушкін быў асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі па абвінавачванні ў знявазе дзяржаўных сімвалаў (арт. 370 КК) і нібыта рэабілітацыі нацызму (арт. 130 КК у старой рэдакцыі). Суддзя Івацэвіцкага раёна Аляксандр Кірыловіч 11 лістапада 2022 года пастанавіў перавесці Алеся Пушкіна на паўтара года ў турму. Неўзабаве палітвязня этапавалі ў Турму № 1 у Гродне. Падставай для пазбаўлення волі мастака сталі перформанс у Кіеве і мастацкія працы,

размешчаныя на выставе, якая праходзіла 19 сакавіка 2021 года ў Гродне. У партрэтах антысавецкіх партызан пракуратура ўбачыла "рэабілітацыю нацызму".

Дзяржава парушыла сваё павышанае абавязацельства клапаціцца аб прыняцці любых неабходных мераў для абароны жыцця асобаў, пазбаўленых волі: пазбаўляючы грамадзян свабоды, дзяржавы *"бяруць на сябе адказнасць за клопат аб іх жыцці і фізічнай недатыкальнасці, пры гэтым у апраўданне яны не могуць спасылацца на адсутнасць фінансавых рэсурсаў або іншыя матэрыяльна-тэхнічныя праблемы; абавязак па абароне жыцця ўсіх затрыманых асобаў уключае ў сябе аказанне ім неабходнай медыцынскай дапамогі і адпаведны рэгулярны кантроль за іх здароўем"* (п. 25 арт. 6 Заўвагаў агульнага парадку № 36).

Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе і Цэнтральнай Азіі, якая захоўвае і прымяняе на практыцы смяротнае пакаранне.

Паводле статыстычных дадзеных аб дзейнасці судоў агульнай юрысдыкцыі, да смяротнага пакарання былі асуджаныя: у 2019 годзе — два чалавекі; у 2020 годзе — тры чалавекі; у 2021 годзе — адзін чалавек; у 2022 годзе — ніхто; у 2023 годзе — адзін чалавек.

У лютым 2023 года стала вядомая дата прывядзення ў выкананне смяротнага прысуду, які ўступіў у сілу 4 траўня 2021 года, у дачыненні да **Віктара Скрундзіка**: ён быў расстраляны 16 ліпеня 2022 года. Беларускія ўлады прывялі ў выкананне смяротны прысуд праз адзін год і паўтара месяца пасля яго вынясення. Справа Скрундзіка разглядалася Вярхоўным судом двойчы: раней вынесены прысуд адмяняўся Вярхоўным Судом па скарзе абвінавачанага і яго абаронцы, справа накіроўвалася на новы судовы разгляд.

25 сакавіка 2023 года ўступілі ў сілу змены ў Крымінальны кодэкс Беларусі, якія прадугледжваюць магчымасць прымянення смяротнага пакарання ў дачыненні да дзяржаўных службовых асобаў і вайскоўцаў, асуджаных за дзяржаўную здраду (ч. 2 арт. 356 КК). Асноўная мэта дакумента — насаджэнне атмасферы страху, бо прыняцце закона суправаджалася звыклай рыторыкай аб узмацненні процідзеяння злачынствам экстрэмісцкай (тэрарыстычнай) і антыдзяржаўнай накіраванасці. Небяспека дадзенага новаўвядзення палягае перш за ўсё ў надзвычай шырокай трактоўцы паняцця "здрада дзяржаве" і адвольным прымяненні закона па палітычных матывах.

У сувязі з чарговым пашырэннем сферы ўжывання смяротнага пакарання праваабарончая супольнасць выступіла з заявай, у якой заклікала ўлады адмяніць не адпаведныя Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах палажэнні Крымінальнага кодэкса, якія прадугледжваюць магчымасць прымянення смяротнага пакарання за негвалтоўныя злачынствы, а таксама за замах на асобныя віды злачынстваў; строга і няўхільна забяспечваць выкананне сваіх міжнародных абавязацельстваў у галіне правоў чалавека, гарантуючы павагу права на жыццё; імкнуцца да поўнага выкаранення смяротнага пакарання, а не пашырэння вобласці яго прымянення, як гэта прадугледжана міжнароднымі стандартамі правоў чалавека.

22 сакавіка 2023 года спецыяльныя дакладчыкі па пытаннях аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі і аб пазасудовых пакараннях смерцю, пакараннях смерцю без належнага судовага разбору або адвольных пакараннях смерцю накіравалі ўраду Беларусі ліст, у якім выказалі занепакоенасць тым, што прапанаваныя папраўкі да Крымінальнага кодэксу могуць павысіць рызыку вынясення смяротнага прысуду адвольным, незаконным і

дыскрымінацыйным чынам. Эксперты падкрэслілі, што "дзяржаўная здрада" не адпавядае крытэрам "найбольш цяжкіх злачынстваў", устаноўленым міжнародным правам, і што прывядзенне ў выкананне любога смяротнага прысуду ў парушэнне абавязацельстваў дзяржавы па міжнародным праве раўнасільна адвольнаму пакаранню смерцю. Адказу на зварот не было.

19 кастрычніка 2023 года быў вынесены першы за апошнія 32 месяцы — са студзеня 2021 года па кастрычнік 2023 года — смяротны прысуд. **Аляксандр** і **Анастасія Таратута** былі прызнаныя вінаватымі ў наўмысным супрацьпраўным пазбаўленні жыцця іншага чалавека (забойстве), заведама малалетняга, асобы, што знаходзіцца ў бездапаможным стане, здзейсненае з асаблівай жорсткасцю, групай асобаў і катаванні, здзейсненым у дачыненні да заведама для вінаватага непаўналетняга, асобы, што знаходзіцца ў бездапаможным стане і ў залежным становішчы. На падставе пунктаў 2, 6, 15 часткі 2 артыкула 139 і часткі 2 артыкула 154 Крымінальнага кодэкса ім прызначана максімальнае пакаранне: Анастасіі Таратуце — пазбаўленне волі на тэрмін 25 гадоў ва ўмовах строгага рэжыму (максімальны тэрмін для жанчын, які прызначаецца ў Беларусі), Аляксандру Таратуту — смяротнае пакаранне. У пачатку 2024 года Вярхоўным судом прысуд пакінуты без зменаў.